Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
27 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 19 (28635)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Такая неадналькавая вайна**
СТАР. 7



**Як вызначаюць падробкі?**
СТАР. 10



**Тэстуем незвычайны электракар**
СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«На 2018 год мы ўзялі планку ў 70 тысяч новых рабочых месцаў. Дэкрэт № 7 і ўказы, якія накіраваны на развіццё малога і сярэдняга бізнесу, будуць спрыяць выкананню гэтай задачы. Ва ўсякім выпадку, умовы для гэтага ёсць. Цяпер важна актыўна выкарыстоўваць магчымасці, якія адкрываюцца з прыняццем пакета дакументаў па лібералізацыі ўмоў вядзення бізнесу. Мы сур'ёзна працавалі над падрыхтоўкай дакументаў, гэта заняло нямала часу.*
*Але гэта толькі 10 % ад усёй работы, яшчэ 90 % прыйдзецца на 2018—2019 гады, каб задачы па стварэнні 70 тысяч рабочых месцаў былі бездумоўна выкананы. Нагадаю, што ўказам Прэзідэнта ўраду даручана штогод ствараць не менш за 50 тысяч рабочых месцаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.01.2018 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9722 ▼ |
| Еўра | 2,4573 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0353 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0691 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# У «Буслінымі маёнтку»



Гаспадар аграсядзібы «Буслiны маёнтак» у вёсцы Бытча Барысаўскага раёна Сяргей КАЗЛОЎ з маленства цікавіўся гісторыяй, калекцыянаваў старыя манеты і папяровыя грошы, рэдкія экзэмпляры значкоў, меў багатую бібліятэку. Калі задумаў стварыць на бацькоўскім падворку аграсядзібу, выкарыстаў для ўпрыгажэння інтэр'ера свае каштоўнасці. А да іх дадаў і прадметы сялянскага побыту, якімі ў недалёкім мінулым карысталіся яго аднавяскоўцы. Адна толькі калекцыя кашоў чаго вартая. А тут жа і самавары, цяслярскі і сталярны рыштунак, прасы і ліхтары, музычныя інструменты, кераміка...

— У аграсядзібу прыязджаюць людзі з розных гарадоў і нават краін, і мая задача — распавесці ім пра гісторыю і самабытную культуру Беларусі. І усё-такі музей — даніна руплівым і майстравітым землякам, — кажа гаспадар «Буслiнага маёнтка».

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Жыць здорава!

## НА ГОРНЫХ СХІЛАХ — І ПАЧАТКОЎЦЫ, І ПРАФЕСІЯНАЛЫ

### Дзе знайсці сябе?

**Беларуская зіма звычайна, як арэлі, але вось ужо другі тыдзень надвор'е дазваляе аматарам спорту перабрацца з закрытых памяшканняў на іскрысты снег і змяніць атмасферу трэнажорнай залы на свежае паветра. У выхадныя і на наступным тыдні сіноптыкі не абяцаюць моцных маразоў, але тэмпература будзе ў межах каля нуля і крыху ніжэй, што захавае снег на схілах у гарналыжных цэнтрах і дазволіць лыжнікам і сноўбардыстам, а можа і проста ахвотным пракаціцца на санках. Сёння мы здзейснім віртуальную экскурсію па гарналыжных комплексах сталіцы і найбліжэйшых да Мінска тэрыторыях, каб падзяліцца з чытачамі цэнамі і прапановамі спартыўных цэнтраў у сталіцы і яе ваколіцах.**

СТАР. 8



## Гарадскі канструктар: неабходныя элементы

### Якія аб'екты адкрыюцца ў Мінску ў гэтым годзе

**Сталіца Беларусі, як і любы іншы буйны горад, жыве ў стадыі бясконцага будаўніцтва і рэканструявання. Штогод у Мінску здаецца ў эксплуатацыю некалькі знакавых збудаванняў, не гаворачы ўжо пра сотні іншых. 2018 год не павінен стаць выключэннем: сталіцу чакае з'яўленне новых сацыяльных, спартыўных, турыстычных, гандлёвых і іншых аб'ектаў. Мы пастараліся разабрацца, у якіх збудаваннях на самай справе больш за ўсё маюць патрэбу горад і яго жыхары.**

### Адкрыццё як свята: у чаканні прыгожых дат

Адной з галоўных падзей года абяцае стаць адкрыццё пасля рэканструкцыі стадыёна «Дынама». Так, само збудаванне не новае, але перарабляюць яго настолькі маштабна, што аматарам футбола, якія правялі на яго трыбунах сотні гадзін у мінулым, можа здацца, што апынуліся яны зусім не ў цэнтры Мінска, а ў адной з прызнаных сталіц гэтага віду спорту. Гісторыя рэканструкцыі стадыёна была вельмі заблытаная: спачатку яго хацелі «перакваліфікаваць» у лёгкаатлетычны, асобна пабудаваўшы нацыянальны футбольны стадыён у іншым раёне, аднак потым ад гэтай ідэі адмовіліся. Тым не менш тэрміны заканчэння будаўніцтва пераносіліся некалькі разоў, апошні раз — з-за праблем з мантажом металаканструкцый. Але з сітуацыі выйшлі прыгожа: датай уводу аб'екта прызначылі чэрвень 2018-га — роўна за год да старту Еўрапейскіх гульняў. Каб падкрэсліць гэтую ўзаемасувязь, у гэты дзень будзе запушчаны зваротны адлік на спецыяльным табло.

Дарэчы, працэс падрыхтоўкі Мінска да Еўрапейскіх гульняў прыкметны шмат у чым. Радуе тое, што галоўны этап будаўнічага буму мінчане перажылі яшчэ некалькі гадоў таму, напярэдадні іншага спартыўнага форуму — чэмпіянату свету па хакеі. Тое, што адбываецца цяпер, можна назваць, хутчэй, апошнімі штрыхамі ва ўжо гатовую карціну. І ўсё ж на палатне з'яўляцца і новыя элементы. Галоўны з іх — Цэнтр мастацкай гімнастыкі. Яго адкрыццё таксама прымеркавана да прыгожай даты, а менавіта да Міжнароднага жаночага дня. Сапраўды, гэты від спорту, у першую чаргу, асацыюецца менавіта з далікатнымі дзяўчатамі, здольнымі грацыёзна выконваць найскладанейшыя практыкаванні. У новым цэнтры спецыяльна для гэтага будзе абсталявана восем пляцовак, чатыры залы харэаграфіі, дзве залы для пачаткоўцаў, таксама тут з'явіцца медыка-аднаўленчы цэнтр і інтэрнат.

СТАР. 4

# НАВУКА ЯК АСНОВА КВІТНЕЮЧАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў дзеячаў навукі, работнікаў навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў з прафесійным святам — Днём беларускай навукі.**

«У сучасным дынамічным свеце навука з'яўляецца асновай пабудовы моцнай і квітнеючай дзяржавы, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Дасягненні беларускіх вучоных — прадмет гонару нашай краіны. Дзякуючы вашым даследаванням і распрацоўкам ствараюцца новыя вытворчасці і цэлыя галіны нацыянальнай эканомікі, з'яўляюцца ўнікальныя медыцынскія тэхналогіі, вырашаюцца пытанні харчовай бяспекі».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што для павышэння прэстыжу навуковай дзейнасці выбудавана сістэма падтрымкі таленавітай моладзі, удасканалены падыходы да аплаты працы, забяспечаны ўмовы для пошуку і творчасці.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што і ў далейшым навука будзе служыць на карысць Беларусі і прыносіць бачную карысць грамадству.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# НІ БОЛЬШ НІ МЕНШ — ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ

**Міністр аховы здароўя Валерый Малашка канстатуе, што жыхары нашай краіны ўсё часцей аддаюць перавагу менавіта беларускім лекам. І прычына не толькі ў тым, што цэны на іх ніжэйшыя. Айчынны вытворца можа гарантаваць якасць прадукцыі. А як гэта забяспечыць у леках, што паступаюць з-за мяжы?**

Дарэчы, тэма цэнаў на лекі, з якой раней звярталіся да кіраўніка дзяржавы, зараз пільна кантралюецца і, у прынцыпе, вырашана. Пра гэта і не толькі ўчора ішла гутарка падчас наведвання Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам фармпрадпрыемства «Мінскінтэркапс» — абмяркоўвалі стан фармацэўтычнай сферы ў цэлым.

— У першым паўгоддзі гэтага года цалкам павінна быць створана манапалізаваная сістэма — поўнасцю празрыстая і падкантрольная вам, сістэма вытворчасці і рэалізацыі лекавых тавараў: і айчынных, і імпартных, — паставіў задачу Прэзідэнт.

Увогуле кантроль за якасцю лекаў павінен быць татальны, бо ад яе залежаць здароўе і жыццё людзей. Але чаму не ўвесь фармацэўтычны рынак знаходзіцца пад кантролем? Кіраўнік дзяржавы прапанаваў поўнасцю ўзяць пад кантроль працэсы па вытворчасці, продажах і імпарце лекаў у краіне.

Яшчэ адна болевая кропка — праблема пасярэдніцтва як у фармгаліне, так і ў іншых сферах. Бо часам заробак пасярэднікаў складае палову ад цаны тавару.

— Гэта робіць даражэйшым тавар. Чаму мы не займаемся гэтым пытаннем? Давайце разбірацца з праблемай, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы ж вялізныя грошы губляем.

Таму адна з галоўных прапаноў, каб высокапастаўленая асоба — міністр або губернатар — давала дазвол на пасярэдніцтва. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў пэўных выпадках без пасярэднікаў не абысціся, але гэта зноў жа павінен вырашаць кіраўнік высокага ўзроўню.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

### Даслоўна

**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

— Прэпараты, якія выпрацоўваюцца на айчынных прадпрыемствах, маюць высокую эфектыўнасць і падвяргаюцца жорсткаму шматступеннаму кантролю якасці на ўсіх этапах па шляху да спажыўца. Гэта дае магчымасць дабіцца таго, што ў Беларусі за апошнія гады не зарэгістравана кантрафактных лекавых прэпаратаў. Сёння мы не маем прэтэнзій з боку замежных спажыўцоў нашых лекаў. У трыццаць тры краіны адбываецца пастаўка. Адпрацоўваюцца новыя рынкі збыту. Мы цікавыя нашым замежным калегам у першую чаргу тым, што прапануем якасны прадукт, досыць шырокую лінейку прадуктаў як традыцыйных, так і новых.

## Парламенцкі дзённік

# Аптымізацыя плюс інавацыі

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч з рабочым візітам наведаў станкабудаўнічы завод «МЗКР», дзе азнаёміўся з асноўнымі фінансавымі паказчыкамі прадпрыемства. На сустрэчы таксама абмяркоўвалася пытанне аптымізацыі і работа з інавацыйным праектам.**

Міхаіл Мясніковіч пабываў у цэхах, дзе вырабляюцца цяжкія шматфункцыянальныя металаРэзныя станкі і апрацоўваюць цэнтры з лічбавым праграмным кіраваннем рознага ўзроўню аўтаматызацыі для апрацоўкі буйнагабарытных дэталяў. Старшыня Савета Рэспублікі выказаў меркаванне, што заводу неабходна прадоўжыць аптымізацыю вытворчых і зямельных плошчаў, каб знізіць выдаткі. «Тым больш што Міністэрствам прамысловасці фактычна прынята рашэнне зрабіць свайго роду кластар з такіх прадпрыемстваў накшталт «МЗКР» і «Станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава». Плануецца сканцэнтраваць яго ў раёне вуліцы Казлова», — падкрэсліў спікер. Разам з гэтым ён выказаў меркаванне, што трэба аптымізаваць зямлю, каб не займаць у цэнтры горада вялікія плошчы, бо каэфіцыент да стаўкі зямельнага падатку досыць вялікі. Таксама заводу неўзабаве неабходна будзе распрацаваць інавацыйны праект, які будзе рэалізаваны за кошт рэспубліканскага, магчыма, Мінскага гарадскога інавацыйнага фонду.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

## Галоўнае

# ПРААНАЛІЗАВАЦЬ СІТУАЦЫЮ КОЖНАГА

**Дэкрэт № 1 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» падпісаны кіраўніком дзяржавы пазаўчора, афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Дзейнічаць нормы гэтага дакумента пачнуць з 1 студзеня 2019 года. Спецыялісты расказалі, на якіх прынцыпах будзе грунтавацца дэкрэт.**

Згодна з Дэкрэтам № 1, збор з непрацуючых грамадзян на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў ажыццяўляцца не будзе. Але з 1 студзеня наступнага года незанятыя ў эканоміцы краіны працаздольныя грамадзяне будуць плаціць за паслугі, якія субсідуюцца дзяржавай, у памеры іх поўнага кошту. Як адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Тамара КРАСОЎСКАЯ**, канкрэтны пералік такіх паслуг пакуль не вядомы. Плануецца, што ён будзе вызначаны ўрадам краіны да 1 красавіка.

«Новы дэкрэт не павінен выклікаць негатыўнай рэакцыі ў грамадстве. Ён комплексна вырашае праблемы сям'і. Камісія будзе прымаць рашэнне, каб чалавек не лічыўся ў спісах не занятых у эканоміцы, калі ў яго ёсць сур'ёзныя жыццёвыя праблемы. Самае ключавое паняцце ў гэтым дакуменце — чалавечы падыход да вырашэння ўсіх праблем», — адзначыла Тамара Красоўская.

**Андрэй ЛАБОВІЧ, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны,** лічыць: «Дэкрэт накіраваны на максімальнае садзейнічанне ў працаўладкаванні, забеспячэнні легальнай занятасці людзей і заснаваны на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці і ўдзелу ўсіх грамадзян у жыцці грамадства і краіны». Асаблівы акцэнт робіцца на ўзмацненні ролі мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў у вырашэнні пытанняў занятасці. Прычым, паводле яго слоў, задача мясцовых органаў заключаецца ў тым, каб працаваць з людзьмі па адмысловай праграме і дайсці да кожнага, хто нават патэнцыйна можа трапіць у спісы непрацуючых. «Мясцовыя органы павінны прапанаваць свае паслугі па працаўладкаванні, навучанні і іншых формах эфектыўнай палітыкі садзейнічання занятасці», — растлумачыў Андрэй Лабовіч. Пры гэтым, калі будуць фарміравацца спісы, кожны грамадзянін можа звярнуцца ў камісію ці адміністрацыю раёна і паведаміць пра патрэбу ў працаўладкаванні. Гэта могуць зрабіць і члены яго сям'і. Акрамя таго, выканкамы будуць рабіць і першы крок насустрач незанятым. Ніхто не збіраецца нікога прымушаць. Задача мясцовых улад — менавіта стварэнне ўмоў, каб у чалавека з'явілася магчымасць працаўладкавання. Паводле слоў першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, у другім паўгоддзі сёлета ў тэставым рэжыме будзе праведзена выпрабаванне ўзаемадзеяння ўсіх органаў улады як на рэспубліканскім, так і на мясцовым узроўні па фарміраванні базы даных працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы.

Прынцыпова новым у вырашэнні праблем занятасці насельніцтва стане штогадовае вызначэнне ўрадам пераліку тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы. Гэта дазволіць адрасна вырашаць пытанні занятасці насельніцтва ў асобных раёнах ці гарадах Беларусі. На такіх тэрыторыях абласныя, Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў змогуць дадаткова накіроўваць сродкі мясцовых бюджэтаў на рэалізацыю мерапрыемстваў у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва.

«Таксама будуць устанаўлівацца пакавартальныя значэнні прагнозных паказчыкаў у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва на рэспубліканскім, абласным і раённым узроўнях. Маніторынг выканання ўладай гэтых заданняў дазволіць кантраляваць сітуацыю на рынку працы рэспублікі і рэгіёнаў і аператыўна прымаць рашэнні па яе рэгуляванні», — дадаў Андрэй Лабовіч.

Пры тым, што над дэкрэтам праведзена вялікая сістэмная работа, па словах Андрэя Лабовіча, цяпер пытанне аб павелічэнні памеру дапамогі па беспрацоўі не разглядаецца. «Летась урадам прапрацоўваліся і былі ўнесены прапановы па ўдакладненні сістэмы страхавання ад беспрацоўя, па павелічэнні памеру дапамогі, але на цяперашнім этапе пакуль гэтыя меры заўчасныя», — дадаў Андрэй Лабовіч. Разам з Дэкрэтам № 1 прапанавана так званая двухузроўневая сістэма разгляду пры стварэнні баз незанятых у эканоміцы. У сувязі з гэтым на мясцовыя органы ўлады ўскладаецца адказнасць падрабязна прааналізаваць сітуацыю кожнага чалавека. Гэта дазволіць вызначыць яго сацыяльны статус, што дапамажа сфарміраваць вычарпальныя і дакладныя спісы на аснове рашэнняў мясцовых органаў улады.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

### Каментарыі ў тэму

**Валерый БАРАДЗЕНЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

— Як Дэкрэт № 1 адаб'ецца на эканоміцы краіны? Не ведаю, час пакажа, асабліва пасля першага студзеня 2019 года. Я думаю, што гэты дэкрэт не эканамічны, а сацыяльна-ідэалагічны. Таму меркаваць, што будуць, напрыклад, нейкія эканамічныя плюсы — наўрад ці. Не з гэтага пункту гледжання ўсё прымалася, а хутчэй для таго, каб у людзей было ўсведамленне пачуцця справядлівасці. У нас жа сацыяльна арыентаваная дзяржава і эканоміка. Адпаведна, калі хтосьці не ўносіць свой уклад і выхваляецца гэтым, узнікае нейкая сацыяльная напружанасць. Зразумела, што гэта нікому не трэба. Што датычыцца менавіта эканамічнага аспекту дакумента і адпаведных фінансавых механізмаў, то я не думаю, што гэта будуць значныя сумы для людзей, у нас жа не так шмат такіх грамадзян.

**Жанна РАМАНОВІЧ, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:**

— Сёння ў Мінску больш за 11 тысяч вакансій. На аднаго беспрацоўнага ў нас больш за пяць вакансій. Работа ёсць і для людзей, якія маюць рабочую прафесію, і для спецыялістаў. Для кожнага чалавека, хто адчувае цяжкасці з пошукам работы, мы прапануем перанавучанне па пяці адукацыйных праграмах. Гэта перападрыхтоўка, падрыхтоўка, навучальныя курсы, па прафесіі і па спецыяльнасці. Толькі на 2018 год мы сфарміравалі 33 прафесіі, па якіх можна навучыцца. І ўсе яны запатрабаваныя на рынку працы.

Апошнім часам было прынята нямала нарматыўных дакументаў, якія дазваляюць чалавеку знайсці работу па душы. Калі ён гэтага так і не зрабіў, то альбо ў яго ценявыя даходы, альбо ён проста прызвычаіўся жыць за кошт іншых. Ёсць тыя, каму прапануеш ужо 31-ю па ліку вакансію з досыць добрай аплатай працы, але вынік застаецца ранейшы.

**Анатоль ШАЛТАНЮК, старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Дэкрэт № 1 накіраваны перш за ўсё на садзейнічанне занятасці насельніцтва. Мы гэтай работай займаемся пастаянна і будзем яе працягваць. У ходзе нядаўніх раённых кірмашоў вакансій давялося яшчэ раз упэўніцца, што работу знаходзіць той, хто хоча працаваць. У нашым адным з самых маленькіх раёнаў краіны на сёння адкрытыя больш за 200 вакансій. У сельскай гаспадарцы патрабуюцца ветурачы і заатэхнікі, механізатары, кіроўцы. У горадзе не хапае медыцынскіх сясцёр, арганізацыі гатовыя прыняць на работу трактарыстаў і бульдазерыстаў. Да райцэнтра нядаўна далучылі чатыры сельскія населеныя пункты, дык не хапае кіроўцаў, каб упарадкаваць рух гарадскіх аўтобусаў. Будаўнічая кампанія набірае будаўнікоў для работы вахтавым метадам у Польшчы. Як бачыце, ёсць розныя прапановы для людзей рознага ўзроўню адукаванасці, акрамя таго, заўсёды можна падвучыцца.

У дакуменце напісана, што раённыя камісіі па садзейнічанні працаўладкаванню ўзначаляць пераважна старшыні Саветаў дэпутатаў. Будзем працаваць, тым больш што пэўны досвед ёсць.

**Тацццяна ЗАХАРАВА, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Аршанскага райвыканкама:**

— У раёне цяпер назіраецца тэндэнцыя па зніжэнні колькасці беспрацоўных. Згодна з афіцыйнай статыстыкай, у нас прапанова ад наймальнікаў перавышае попыт. Ёсць вакансіі для швачак, фармацэўтаў, урачоў, токараў, слесараў. Аптымізацыя на прадпрыемствах была нязначная, таму яна не паўплывала на напружанасць на рынку.

Пытанне: што рабіць з катэгорыяй, якая працаваць не хоча? Бываюць выпадкі, калі мамы прыходзяць прасіць за сваіх дарослых здаровых сыноў. Многіх з іх мы не бачым, таму нават не можам улічыць. Будзем чакаць тлумачэнняў да дэкрэта пра тое, якую работу праводзіць з гэтымі грамадзянамі.

Летась камісія пры выканкаме для садзейнічання занятасці працавала прадуктыўна. Кожны выпадак разглядаўся індывідуальна. Нельга адназначна адказаць, што адносіць да цяжкай жыццёвай сітуацыі. Трэба ўлічваць абставіны кожнага чалавека асобна.

**Аляксандр МАШКО, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і персанале холдынга «Атлант»:**

— Вакансіі на прадпрыемстве ёсць. Са спецыялістаў патрэбны праграмісты, інжынеры-канструктары, бізнес-аналітыкі. Вядома, на гэтыя месцы запрашаюцца людзі з вышэйшай адукацыяй. Калі казаць пра рабочыя прафесіі, то неабходны аператары станкоў з праграмным забеспячэннем, слесары-інструментальшчыкі, шліфоўшчыкі. Ёсць таксама вакансіі, дзе не патрабуецца кваліфікацыя: грузчыкі, кладаўшчыкі, электраманцёры. Заробкі розныя: ад 650 да 1000 рублёў. Прапановы, лічу, годныя.

Колькасць вакансій залежыць ад аб'ёмаў работы. У красавіку, напрыклад, будзем набіраць каля 150 чалавек. Летам таксама запросім студатрады

■ Кропкі над «і»

# УЗРОВЕНЬ ВЕДАЎ — У РУКАХ НАСТАЎНІКАЎ

## У школах і гімназіях будуць ствараццa аднолькавыя ўмовы для развіцця дзяцей

**Бацькі чацвёртакласнікаў, якія вучыліся ў пачатковай школе пры гімназіі, могуць выдыхнуць — кашмар у выглядзе падрыхтоўкі да будучых экзаменаў і невядомасці (паступіць/не паступіць або давядзецца змяняць навучальную ўстанову і калектыў) для іх адступіў: экзамены ў гімназіі ўказам кіраўніка дзяржавы адменены. Затое бацькі, якія аддалі сваё дзіця ў найбліжэйшую да дома навучальную ўстанову і былі ўпэўнены, што ў іх ёсць чатыры гады на тое, каб ацаніць здольнасці дзіцяці і вызначыцца з выбарам гімназіі, — сёння моцна азадачаны. Намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА паспрабавала заспакоіць апошніх і расказала журналістам пра будучыню гімназій і сярэдніх школ.**

— Калі прымалася рашэнне аб адмене экзаменаў, у першую чаргу браўся пад увагу псіхалагічны складнік гэтага пытання: экзамен, як правіла, стварае вельмі моцнае напружанне для дзяцей. Наколькі яно было апраўданае, можна абмяркоўваць, тым больш што рашэнне за дзіця прымалі яго бацькі, кіруючыся нейкімі сваімі доказамі. Наўрад ці дзіця было ўпэўнена, што яно хоча навучацца ў нейкай канкрэтнай гімназіі, — патлумачыла яна. — Цяпер усе дзеці, якія навучаюцца ў чацвёртых класах гімназій, змогуць аўтаматычна перайсці ў пяты клас гэтай жа ўстановы адукацыі. Выключэнне складаюць толькі 5-я класы гімназій-каледжаў мастацтваў, дзе конкурсны адбор па выніках праверкі творчых здольнасцяў па-ранейшаму захоўваецца.

«А што рабіць, калі здольнасці дзіцяці не дазволяць яму ўпэўнена адчуваць сябе сярод больш падрыхтаваных аднакласнікаў у гімназіі?» — пацікавіліся журналісты.

— Усё ў руках настаўніка. Мы кажам сёння пра дыферэнцыраваны падыход да навучэнцаў. Стварыць умовы для развіцця дзіцяці, у якога цяпер вынікі крыху ніжэйшыя, чым хацелася б бацькам ці настаўніку, — задача педагога, — адказала намеснік міністра.

Цяпер пры прыёме ў першы клас будзе дзейнічаць тэрытарыяльны прынцып. Гэта значыць, што дзіця пойдзе ў найбліжэйшую да яго месца жыхарства ўстанову адукацыі: гэта можа быць і гімназія, і сярэдняя школа. Дарэчы, сёння ў краіне дзейнічаюць 215 гімназій, 28 з іх не маюць пачатковай школы. Цяпер ім давядзецца адкрываць і пачатковыя класы.

Тэрытарыяльны прынцып адбору дзяцей не будзе дзейнічаць пры камплектаванні беларускамоўных гімназій, бо, напрыклад, у 23-ю сталічную гімназію дзяцей прывозяць з усяго горада.

«У выпадку жорсткай тэрытарыяльнай прывязкі паўстане пытанне з існаваннем такіх гімназій. А мы максімальна зацікаўлены ў тым, каб захаваць нашы беларускамоўныя ўстановы адукацыі», — падкрэсліла намеснік міністра.

Яна таксама адзначыла, што ў 2015 годзе ва ўсіх установах адукацыі вярнулі вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, але толькі на старшай ступені школы.

— Рашэнне, якое мы прымем цяпер і будзем яго закладваць у нашы нарматыўныя дакументы, — гэта выдзяленне дадатковых гадзін на падрыхтоўку да павышанага вывучэння гэтых прадметаў ужо на другой ступені, гэта значыць, у 5—9-х класах, — дадала Раіса Сідарэнка. — Сёння навучальныя праграмы ў гімназіях і звычайных школах абсалютна аднолькавыя. Ніякіх асаблівых праграм для гімназій з 2008 года няма. Адзінае, у іх ёсць дзве дадатковыя гадзіны на вывучэнне замежнай мовы. Мы прапануем гэтыя гадзіны вызваліць ад прывязкі да замежнай мовы. Гімназія сама зможа вызначаць, на якія прадметы іх дадаткова накіраваць. Гэта можа быць і замежная мова, і матэматыка, і фізіка, а таксама любы прадмет па выбары ўстановы адукацыі з улікам пажаданняў бацькоў і саміх навучэнцаў. Хачу заўважыць, што Указ дазваляе гэтыя дзве дадатковыя гадзіны выкарыстоўваць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ўсіх відаў, гэта значыць, у любой школе.

Сёння ў краіне дзейнічаюць толькі тры гімназіі-інтэрнаты для дзяцей з сельскай мясцовасці. Усе астатнія вучні 5—9-х класаў пазбаўленыя магчымасці дадатковага вывучэння нейкіх прадметаў, той жа замежнай мовы (толькі за кошт факультатыўных заняткаў). Указ дазволіць арганізаваць такое вывучэнне на павышаным узроўні ў любой сельскай школе, калі для гэтага ёсць кадры, жаданне, матывацыя ў вучняў і іх бацькоў.

— Мы ствараем умовы для таго, каб дзіця магло развівацца ў кожнай установе адукацыі, а не ў нейкіх элітарных. На якой падставе ў 7 % устаноў дзеці могуць атрымліваць нейкую асаблівую адукацыю, а ўсе астатнія пазбаўлены такой магчымасці? Між іншым сярод пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд 25 % складаюць вучні звычайных школ. І я абсалютна перакананa, што дзіця трэба аддаваць не ў гімназію з прыгожай шыльдай, а весці яго да настаўніка, які навучыць дзіця ў пачатковай школе галоўнаму — вучыцца, — падкрэсліла Раіса Сідарэнка.

Міністэрства адукацыі плануе вынесці ў найбліжэйшыя дні на абмеркаванне грамадскасці праекты нарматыўных дакументаў — Тыпавы вучэбны план і Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі. У адпаведнасці з указам, у Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры ёсць два месяцы для таго, каб падрыхтаваць і абмеркаваць усе пытанні, звязаныя з рэалізацыяй норм указа.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

**28 февраля 2018 г.** **№3-С/2018**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Наличие ограничений | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб./коп. | Сумма задатка, руб./коп. | Затраты на подготовку документации, руб./коп. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Район индивидуальной жилой застройки Химы по ул. Евдокима Романова, 1 | 340100000007001783 | 0,0736 | Охранная зона сетей и сооружений канализации, электрических сетей | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 13 657 р. 61 коп. | 400 р. 00 коп. | 1 999 р. 32 коп. + сумма возмещения убытков 11 196 р. 96 коп. |
| 2 | Район индивидуальной жилой застройки Хутор (уч. № 414 по генплану) по ул. Сиреневой, 24Д | 340100000007005927 | 0,1155 | Охранная зона объектов газораспределительной системы | | 21 273 р. 20 коп. | 400 р. 00 коп. | 1 896 р. 79 коп. + сумма возмещения убытков 1 334 р. 81 коп. |

1. Организатор аукционных торгов — Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6.
3. **Аукцион состоится 28 февраля 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.
4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа — оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
**Необходимые документы:**
4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 27 января по 26 февраля 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00—13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6.**

**Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.40 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.**

**Контактный телефон: 41-97-86. Информация размещена на сайте www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МЕРКЕЛЬ ЗАЯВІЛА, ШТО РАШУЧА НАСТРОЕНА СФАРМІРАВАЦЬ УРАД З СДПГ



Праўленне Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ) выказалася за кааліцыйныя перамовы з альянсам Ангелы Меркель. «Мы таксама звернем увагу на тое, каб весці перамовы хутка. Я думаю, людзі чакаюць, што мы прасунемся ў пытанні фарміравання ўрада. І таму я настроена аптымістычна і рашуча, што мы павінны дасягнуць выніку, і думаю, што нам па сілах зрабіць гэта ў агляднай будучыні», — заявіла Меркель перад пачаткам перамоў у Берліне. Трансляцыю выступлення праводзіла відэаагенцтва тэлеканала RT Ruptly. Па словах Меркель, створаны «вельмі добры каркас для таго, чаго мы хочам цяпер дамагчыся на кааліцыйных перамовах».

### ПАЖАР У БАЛЬНІЦЫ Ў ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ ПРЫВЁЎ ДА ГІБЕЛІ АМАЛЬ 40 ЧАЛАВЕК

Яшчэ больш за 70 чалавек пацярпелі. Мяркуецца, што пажар узнік у прыёмным пакоі бальніцы Седжон у горадзе Мілянг на паўднёвым усходзе краіны. У будынку бальніцы і ў суседнім доме для састарэлых знаходзілася прыкладна 200 пацыентаў. Гэты пажар стаў найбуйнейшым па колькасці ахвяр у гісторыі краіны за амаль дзесяцігоддзе. Колькасць загінулых павялічваецца, паколькі многія з выратаваных знаходзяцца ў крытычным стане.

### 82 % СУСВЕТНАГА БАГАЦЦЯ ВАЛОДАЕ 1 % НАСЕЛЬНІЦТВА ЗЯМЛІ

У традыцыйнай справаздачы міжнароднай дабрачыннай арганізацыі Oxfam паведамляецца, што капітал найбагацейшых людзей планеты за год вырас, паведамляе «Нямецкая хваля». Пры гэтым з 2016 па 2017 год колькасць мільярдэраў беспрэцэдэнтна вырасла. Па звестках арганізацыі, новы мільярдэр з'яўляўся ў сярэднім кожныя два дні. Усяго ў свеце — 2043 чалавекі, якія лічацца мільярдэрамі. «Бум мільярдэраў сведчыць не пра квітнеючую эканоміку, а пра крах эканамічнага парадку», — заўважыў дырэктар Oxfam International Віні Бьяньіма. 3,7 мільярда чалавек, якія складаюць найбольш бедную частку сусветнага насельніцтва, наогул нічога не атрымалі ад глабальнага ўзрослага прыбытку. Oxfam прагназуе, што ў свеце будзе расці незадаволенасць няроўнасцю, а гэта, у сваю чаргу, можа прывесці да новых кардынальных палітычных змен.

### ЗНАХОДКА АНТРАПОЛАГАЎ НА ПОЎНАЧЫ ІЗРАІЛЯ МЯНЯЕ ЎЯЎЛЕННЕ АБ ЭВАЛЮЦЫІ HOMO SAPIENS



Міжнародная група антраполагаў прааналізавала найстаражытнейшыя астанкі сучаснага чалавека (Homo sapiens), знойдзеныя за межамі Афрыкі, і прыйшла да высновы, што чалавек разумны з'явіўся на зямлі значна раней, чым да гэтага часу лічылася. Гаворка ідзе пра фрагмент сківіцы з зубамі старажытнага чалавека, які быў знойдзены падчас раскопак у пячоры Мislія ў раёне гары Кармэль на поўначы Ізраіля. Вынікі даследавання апублікаваныя ў часопісе Science.

■ Факт

## Летась пабудавана 3,8 млн «квадратаў» жылля

**Згодна з інфармацыяй на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у 2017 годзе арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 43,1 тысячы кватэр, уведзена ў эксплуатацыю 3792,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля.**

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1238,3 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 32,7 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, пабудавана з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі 587,9 тысячы «квадратаў», у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 659,1 тысячы квадратных метраў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Здарэнне

## СТАЎКА — ЦАНОЙ У ЖЫЦЦЁ

**У Пінску малады мужчына добраахвотна пайшоў з жыцця, бо прайграў у аўтаматы дзве тысячы долараў.**

35-гадовы жыхар вёскі Пінкавічы ў зале ігравых аўтаматаў Пінска прайграў названую суму і, не маючы чым разлічыцца, пайшоў на бераг Піны. Ён яшчэ паспраціў у выпадковых дзяўчат тэлефон, пазваніў у міліцыю, нібы хапаўся за апошнюю саломінку. Сказаў, што пакідае жыццё добраахвотна, назваў прычыну. А потым ступіў на тонкі лёд і пайшоў пад ваду. Цела знайшлі бліжэй да абеду наступнага дня...

Пінкавічы вядомыя ў нашай краіне музеем Якуба Коласа, узведзеным на месцы школы, дзе выкладаў будучы класік. У часы настаўніка Міцкевіча 35-гадовыя мужчыны былі галоўнымі працаўнікамі, той сілай, на якой трымалася сям'я. Ім і ў галаву не прыходзіла траціць жыццё на такога кшталту забавы...

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Знешняя палітыка

# ДВУХБАКОВАЕ ПАРТНЁРСТВА

**На пачатку наступнага тыдня ў Вене адбудуцца пасяджэнні беларуска-аўстрыйскай міжурадкамісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і беларуска-аўстрыйскага дзелавога савета. Пра гэта на брыфінгу паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК. Нашу дэлегацыю ўзначаліць намеснік міністра замежных спраў і сустаршыня міжурадкамісіі Алег Краўчанка.**

На пасяджэнні плануюць абмеркаваць інвестыцыйнае супрацоўніцтва і перспектывы двухбаковага гандлёва-эканамічнага развіцця, а таксама ўзаемадзеянне ў галінах прыродаахоўных тэхналогій, аднаўляльнай энергетыкі, рэгіянальнага супрацоўніцтва і турызму. Акрамя таго, запланаваны правядзенне беларуска-аўстрыйскага дзелавога савета, двухбаковы бізнес-форум і кантактна-каапераційная біржа.

Тым часам у Мінску пройдзе пасяджэнне міжурадавай беларуска-грузінскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве. На ім плануецца падвесці вынікі мінулага года і абмеркаваць рэалізацыю праектаў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, транспарце і іншых галінах. «У цэлым хацеў бы адзначыць, што Беларусь і Грузія прыкметна прасунуліся ў эканамічнай сферы за апошні час. У 2016 годзе тавараабарот паміж нашымі краінамі павялічыўся на 63 % да 73,2 млн долараў. За студзень — лістапад мінулага года ён узрос яшчэ амаль на чвэрць», — паведаміў Дзмітрый Міронычк. Беларускую частку міжурадкамісіі ўзначаліць намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл Русы.

***

У суботу ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета адбудзецца мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму дню памяці ахвяр халакосту. Сусветна вядомы твор Джузэпэ Вердзі «Рэквіем» выканаюць артысты і музыканты пад кіраўніцтвам ізраільскага дырыжора Амоса Тальмона. У адкрыцці мерапрыемства возьме ўдзел намеснік міністра замежных спраў Андрэй Дапкюнас. Як паведаміў прэс-сакратар МЗС, «на мерапрыемства запрошаны прадстаўнікі шэрага пасольстваў краін — суаўтараў адпаведнай рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН, якой абвешчаны згаданы дзень памяці, а таксама дзяржаўных органаў і грамадскасці».

# БАЛІВУД ПРЫЕДЗЕ Ў МІНСК?

## Індыйскі акцёр жадае зняць фільм пра Беларусь

**Нашы турысты любяць адпачываць на Гаа, асабліва ўзімку, але індыйскіх грамадзян не так лёгка знайсці ў нашай краіне. Бо не ўсе індыйцы ведаюць, што ў нас так прыгожа, — і гэта варта выправіць.**

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Беларусі Саксена Панкадж расказаў, што адзін з вядомых індыйскіх акцёраў плануе зрабіць фільм пра Беларусь. Сам спадар пасол адзначыў, што яму з сям'ёй, напрыклад, вельмі падабаецца адпачываць на Нарачы. У фільме, як мяркуе дыпламат, можна паказаць беларускую прыроду і таленты нашых танцораў.

Учора ў Індыі адзначылі нацыянальнае свята — Дзень Рэспублікі. На прэс-канферэнцыі, прысвечанай гэтай падзеі, Саксена Панкадж расказаў пра двухбаковае супрацоўніцтва краін. Так, ён заўважыў: штодня пасольства выдае каля 60—70 віз грамадзянам Беларусі. Адносна палітычных кантактаў ён нагадаў, што летась краіны адзначалі 25 гадоў з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін. Па эканамічным кірунку пасол адзначыў, што індыйскія прадпрымальнікі гатовы супрацоўнічаць з Беларуссю. Напрыклад, у фармацэўтычнай галіне... дапрацоўкі: калі ў нашай краіне будуць упакоўвацца індыйскія прадукты і пастаўляцца далей на экспарт.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■ Добрая навіна

# АДЗІНЫ Ў ВОБЛАСЦІ

## Абласны цэнтр дэрматалагічнай дапамогі адкрыты ў Гродне

**Базай для цэнтра стаў новы скурна-венералагічны дыспансер, дзе будзе аказвацца спецыялізаваная дапамога жыхарам усяго рэгіёна.**



Новы корпус размясціўся ў прыгожым будынку ў цэнтры горада. Раней тут знаходзілася бальніца чыгуначнікаў, затым — ваенны шпіталь. Цяпер, пасля рамонту, створаны ўсе ўмовы для лячэння скурных і венералагічных захворванняў. На базе дыспансера будзе працаваць адзіны ў вобласці дэрматалагічны цэнтр, куды змогуць звярнуцца па кансультацыю жыхары рэгіёна. Гэта таксама і вучэбная база для студэнтаў-медыкаў і маладых спецыялістаў-стажораў. Тут размясцілася кафедра дэрматалогіі і венералогіі з сучасным абсталяваннем.

Як расказала **галоўны ўрач дыспансера Вольга КУРАТЧЫК,** лячэбная ўстанова разлічана на 120 стацыянарных месцаў, а таксама 30 ложкаў для дзённага знаходжання. Асобны паверх адведзены для дзяцей са скурнымі хваробамі, яшчэ адзін — такі ж для дарослых. Усе аддзяленні заніраваныя, паміж імі няма кантакту.

Кіраўнік лячэбнай установы асобна адзначыла новыя, сучасныя ўмовы, якія створаны для аказання медыцынскай дапамогі і работы персаналу. Яны не параўнальныя з тымі, што былі раней, калі дыспансер знаходзіўся ў старым будынку канца XIX стагоддзя. Вялікія памяшканні, адсутнасць строгіх умоў для роўных катэгорый хворых стварылі пэўныя цяжкасці. Цяпер сітуацыя кардынальна змянілася. Сучасныя палаты разлічаны на 2—4 чалавекі, працэдурныя пакоі маюць усё неабходнае абсталяванне. Што датычыцца кантынгенту хворых, асноўная колькасць — 80 % — гэта пацыенты з незаразнымі скурнымі захворваннямі, такімі як псарыяз і экзэма. Па словах Вольгі Куратчык, у рэгіёне значна знізілася колькасць венерычных захворванняў, рэгіструюцца адзінкавыя выпадкі. У летні сезон адзначаецца рост мікраспарыі ў дзяцей, якія кантактуюць з хворымі жывёламі.

У далейшым медыцынская дапамога будзе ўдасканальвацца. На чарзе — будаўніцтва паліклінічнага корпуса, які пакуль знаходзіцца на другім канцы горада. З цягам часу ўвесь комплекс размесціцца ў адным месцы.

**Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

— За мінулы год адкрыта нямала сацыяльных аб'ектаў. Напрыканцы года ўступілі ў строй новая гарадская паліклініка, дом сямейнага тыпу, дзіцячыя садкі ў вобласці. І на гэты год аблвыканкамам зацверджана інвестыцыйная праграма, у якой значнае месца займаюць аб'екты сацыяльнай сферы. Плануецца завяршыць будаўніцтва хірургічнага корпуса ў Ваўкавыску, адрамантаваць абласны цэнтр «Фтызіятрыя», адкрыць новыя школы, садкі, дамы сямейнага тыпу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

# Гарадскі канструктар: неабходныя элементы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Горад у горадзе і яшчэ пара гасцініц

Калі пытанне, дзе выступаць і спаборнічаць, можна назваць галоўным, то другое па значнасці — дзе размясціць саміх спартсменаў і гасцей турніру. Калі гаварыць аб спартсменах, то для іх чарговы раз расчыніць свае дзверы студэнцкая вёска. Комплекс ужо практычна завершаны: цяпер тут функцыянуе сем інтэрнатаў, а ў гэтым годзе абяцаюць адкрыць і апошні, восьмы, які будзе прызначаны спецыяльна для маладых навукоўцаў і аспірантаў. У цэлым, студэнцкая вёска ўжо цяпер уяўляе сабой горад у горадзе. Не пакідаючы яе межы, можна паабедаць у кафэ, зрабіць неабходныя пакупкі ў краме, схадзіць на стрыжку, аднесці бялізну ў пральню, узяць кнігі ў бібліятэцы, наведаць доктара, а таксама заняцца спортам і творчасцю ў спецыяльна абсталяваных для гэтага месцах. І ўсё гэта — у асяроддзі равеснікаў, захопленых самымі рознымі сферамі. Калі б яшчэ на вучобу не трэба было выязджаць...

Але цяпер гутарка зусім не пра гэта, а пра тое, дзе ж будуць жыць госці гульняў і іншыя турысты, якія зараз так актыўна імкнуцца завабіць у краіну, у тым ліку і дзякуючы бязвізаваму рэжыму. Праблем з колькасцю месцаў для іх размяшчэння ў Мінску дакладна няма, але гасцініцы працягваюць расці як грыбы пасля дажджу. Сёлета павінны адкрыцца яшчэ тры. Самая буйная — гатэль Mercure на вуліцы Зыбіцкай. Гасцініца, прызначаная для тых, хто відавочна збіраецца прыехаць у Мінск не для таго, каб па начах спаць моцным сном. Суседства з самым тусовачным месцам горада проста абавязвае ўлівацца ў начное жыццё, нават і не па ўласнай волі. Дарэчы, начное жыццё сталіцы штогод набывае ўсё большыя маштабы: калі б мы ўзяліся пералічваць усе перапеты з навакольнымі барамі, якія адкрываюцца, знікаюць або проста мяняюць назвы літаральна з хуткасцю святла, баюся, для гэтага не хапіла б цэлай газетнай паласы. А што будзе адбывацца бліжэй да лета 2019 года? Нават уявіць цяжка.

Яшчэ адзін, але ўжо шматфункцыянальны комплекс адкрыецца побач з кінатэатрам «Перамога». У ім размесціцца, вядома ж, гатэль, а таксама кафэ і спа-цэнтр. Акрамя таго, менавіта тут атрымае прапіску офіс Беларускай федэрацыі гарналыжнага спорту і сноўборда, такое суседства — нетыповая для Мінска, але вельмі перспектыўная практыка. Дарэчы, сам кінатэатр «Перамога» ўжо больш за год зачыні на рэканструкцыю. Гэтая тэма выклікала гарачае абмеркаванне сярод мінчан: многія пабаяліся, што вонкавае аблічча будынка можа стаць занадта «сучасным», што сатрэ напамін пра яго багатую гісторыю і ён як адна з шматлікіх будынкаў Мінска яшчэ з даваенных гадоў. У сярэдзіне студзеня адміністрацыя Цэнтральнага раёна прапанавала жыхарам горада даслаць свае ідэі па яго рэканструкцыі і пераўтварэнні, пасля чаго адбылося абмеркаванне ў закрытым рэжыме. Канчатковае рашэнне да гэтага часу не вынесена, хоць першапачаткова на рэканструкцыю закладваўся тэрмін 16 з паловай месяцаў, 13 з якіх ужо прайшлі.

Вяртаючыся да тэмы гасцініц: трэцяя з іх павінна адкрыцца непадалёк ад аквапарка «Лебядзіны» ў адным раёне з Цэнтрам мастацкай гімнастыкі.

## На шопінг — як на работу

Не абміне Мінск сёлета і адкрыццё чарговага гандлёвага комплексу. Гандлёвых пляцовак у сталіцы становіцца так шмат, што, здаецца, асноўнай прафесіяй гараджан павінен быць прадавец-кансультант, асабісты шопер (той, хто складае гардэроб заможным людзям) або, у крайнім выпадку, модны блогер. Але гэта не так ні ў першым, ні ў другім, ні ў трэцім выпадку. Але, пакуль мы задаём пытарычнае пытанне «Для каго гэта ўсё?», дзесяці пачынаюць капаць чарговы катлаван. Незапатрабаванасць пляцовак выклікала хвалянанні ў тым ліку і сярод бізнесменаў. Так, на сустрэчы з кіраўніком Мінгарвыканкама Андрэем Шорцам уладальнік ГЦ Outleto Міхаіл Супруновіч выказаў меркаванне, што трэба рабіць больш жорсткім дзяржаўнае рэгуляванне інвестыцыйных праектаў, праводзіць іх дасканалую эканамічную экспертызу, каб не будавалася так шмат непатрэбных аб'ектаў. Але нават калі ў Мінску дабудуюць толькі тыя гандлёвыя комплексы, якія ўжо пачалі ўзводзіць, іх будзе, кажучы простай мовай, «занадта».

Усё адбываецца па адной схеме: спачатку да гандлёвага цэнтра ўзнікае вялікая цікавасць, у яго імкнуцца трапіць усе, але так працягваецца роўна да таго моманту, пакуль не з'явіцца новы, больш «модны» канкурэнт. Добры прыклад таму — ГЦ «Сталіца». Раней туды абавязкова вадзілі ўсіх, хто прыязджаў у Мінск у госці, гэта было любімым месцам збору мінскіх падлеткаў, а ў чэргах у прымерачную можна было адстаяць больш за гадзіну. Зараз жа ад былой папулярнасці не засталося і следу: рэдкія пакупнікі са здзіўленнем выяўляюць, што чарговая крама перастала тут існаваць. Кіраўніцтва цэнтра нават прапанавала мінчанам дасылаць свае ідэі, як яго можна кардынальна пераўтварыць, напрыклад, зрабіць фудкорт, вялікі дзіцячы пакой і пляцоўку для канцэртаў унізе. А вось яшчэ толькі трэба будзе заваяваць папулярнасць гандлёва-забаўляльнаму цэнтру DiaMond, які ў гэтым годзе адкрыюць непадалёк ад кальцавой у раёне Малінаўкі. Кожны ж верыць, што яго абміне агульная доля.

Што датычыцца простых мінчан, то іх, натуральна, у першую чаргу хвалююць аб'екты сацыяльнай сферы. Так, у сталіцы павінны прыняць новых вучняў тры школы на Паўднёвым Захадзе і ў мікрараёнах Каменная Горка і «Дружба», у апошнім таксама з'явіцца дзіцячы сад, яшчэ адзін будзе пабудаваны ў «Лебядзіным». Працягваецца будаўніцтва тыпавых басейнаў у кожным раёне. Першы ўжо функцыянуе ў Брылевічах. Рэжым яго работы нават спрабавалі зрабіць кругласутачным, але аказалася, што гэта паслуга зусім незапатрабаваная. Дарэчы, пра спорт: нарэшце здадзены ў эксплуатацыю шматпакетны фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Малінаўцы, але дакладныя тэрміны, калі ён сапраўды запрацуе, пакуль ніхто назваць не вырашаецца. А раптам у спіс аб'ектаў, насупраць якіх на працягу года можна будзе паставіць галачку «зроблена», дададуць яшчэ адзін пункт?

**Дар'я КАСКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Космас. Беларускі след

# Пётр Віцязь: «Ведаў: чаго б гэта ні каштавала, займуся навуковымі даследаваннямі»

**Каб аб'ектыўна ацэньваць стан любой галіны чалавечай дзейнасці — карысна ведаць пра людзей, якія гэтыя галіны ствараюць і развіваюць. Звярнуўшыся да айчыннай касмічнай галіны, мы прысвячаем яе героям ужо трэці «касмавыпуск».**

**Наш сённяшні суразмоўца — акадэмік Пётр ВІЦЯЗЬ, вучоны і практык, у творчым багажы якога каля 1000 навуковых прац, у тым ліку больш за 200 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, больш за 80 новых матэрыялаў і тэхналогій, якія ўжо шмат гадоў выкарыстоўваюцца ў розных вытворчых галінах — машынабудаванні, станкабудаванні, энергетыцы, а таксама касмічнай, абароннай тэматыкі, у экалогіі, медыцыне і іншых. Як педагог ён падрыхтаваў сотні інжынераў, 23 кандыдаты і 14 дактароў навук.**



***— Пётр Аляксандравіч, вы ж нарадзіліся на хутары ў Заходняй Беларусі, у шматдзетнай сялянскай сям'і. Як, калі, чаму вы задумаліся пра космас?***

— Гэта была дзівосная падзея, сусветнага маштабу — запуск першага штучнага касмічнага спадарожніка. Яркае ўражанне, вестка, якая прагучала як гром сярод яснага неба, штосьці неспасцiжнае для свядомасці — самаробны спадарожнік цяпер лётае вакол Зямлі!

***— А хіба не было ў школе такіх прадметаў, як геаграфія, астраномія?***

— Былі, але гаварылася там зусім няшмат, пра сонечную сістэму, зоркі... Хоць мы і самі бачылі, што адбываецца на небасхіле, але каб чалавек мог запусціць спадарожнік! Ніхто з нас не быў гатовы да такога адкрыцця космасу. Гэта падзея вельмі запала ў душу і прымусіла ўпершыню задумацца пра сур'ёзнасць і значнасць навукі.

***— А якой была ваша паспяховасць па фізіцы і матэматыцы?***

— Не скажу каб я быў першы па гэтых прадметах, але і не апошні. Быў у сярэдзіне. Любіў тэхніку. Як усе вясковыя хлапчукі, мог многае паправіць па гаспадарцы. Другое яркае ўражанне — не меншае, чым першае, — палёт Юрыя Гагарына. Тады быў дзіўны не толькі факт, што ўпершыню чалавек паляцеў у космас, але і тое, што мы абагналі ўвесь свет. Гэта было ўсяго праз 15 гадоў пасля заканчэння вайны, многія людзі толькі-толькі акрыялі ад гора страты блізкіх і пасляваеннага голаду, краіна яшчэ не аднавілася ва ўсіх сферах дзейнасці.

Гэтыя два ўражанні пакінулі самы глыбокі след у маёй свядомасці з пункту гледжання магчымасцяў чалавека. Менавіта ад іх у мяне ўзнікла цікавасць да навукі. І калі заканчваў інстытут, ужо ведаў: чаго б гэта ні каштавала — займуся навуковымі даследаваннямі. Тады ў інстытутах была не тая сістэма, як цяпер. Былі гурткі па розных тэмах, але адзінкавыя. Але як трапіць у вялікую навуку — уяўлення не меў. Гэтая мэта здавалася тады недасягальнай, хоць і самай жаданай. Просты хлапчук з хутара і раптам — вучоны. Ну, магчыма, інжынер — гэта можна было ўявіць. А вось як стаць навукоўцам?

Пасля заканчэння інстытута ў 1960-м працаваў на заводзе «Ударнік» (цяпер гэта «Амкадор») майстрам у службе галоўнага механіка. Там размяшчалася галіновая лабараторыя парашковай металургіі з БПІ (цяпер БНТУ). Па іх просьбах часцяком дапамагаў рамантаваць абсталяванне. Навуковым кіраўніком лабараторыі быў прафесар Алег Роман (пазней — акадэмік), а начальнікам — Міхаіл Куцэр. Ён і прапанаваў: чаго ты ўсё рамантуеш, пераходзь ужо працаваць да нас. Я з задавальненнем перайшоў у лабараторыю. І адтуль, з развіццём новай галіны — вырас ад інжынера да акадэміка. Лабараторыя развілася з галіновай у праблемную, у інстытут, затым у рэспубліканскае аб'яднанне, дзяржаўны канцэрн, у якіх ствараліся канструктарскае бюро, выпрабавальны палігон, доследная вытворчасць, завод парашковай металургіі... Вось так — сустрэча з цудоўнымі, творчымі людзьмі цалкам павярнула мой лёс на шлях вялікай навукі. Алега Романа я лічу сваім настаўнікам. Дзякуючы яму ў нашай рэспубліцы створана галіна парашковай металургіі і навуковая школа па новых кампазіцыйных матэрыялах, па якіх ужо абаронена паўсотні доктарскіх і больш як сотня кандыдацкіх дысертацый. Парашковая металургія — гэта перш за ўсё матэрыялы магнітныя, звышцвёрдыя, фрыкцыйныя, антыфрыкцыйныя, канструкцыйныя. Дарэчы, усё гэта выдатна падыходзіць для работы ў космасе.

Яшчэ важны этап. Калі Алег Роман прыехаў у 1961 годзе са стажыроўкі ў ЗША, то накіраваў усіх супрацоўнікаў лабараторыі займацца новымі тэхналагічнымі працэсамі, як цяпер гавораць, інавацыйнымі. І для гэтага — усім вучыць замежныя мовы і ездзіць на навуковыя стажыроўкі. Аб'ядналь намаганні па ўдзеле ў міжнародных канферэнцыях, выставах — каб знаёміць нашу тэхнічную грамадскасць з сусветнымі дасягненнямі ў галіне парашковай металургіі і кампазіцыйных матэрыялаў. Гэтая стратэгія працуе да цяперашняга часу.

Тады і я прайшоў шэраг навуковых стажыровак, з іх асабліва вылучаю першую — у Шведскім інстытуце даследавання металаў у Стакгольме ў 1966 годзе. Вядома, што ў Швецыі вельмі якасныя руды. І на ўсіх стадыях тэхнічнага развіцця ім удавалася атрымліваць лепшыя матэрыялы, чым у іншых краінах. Стажыроўка дала мне арганізацыйны досвед і дадатковыя веды не толькі па матэрыялазнаўстве, але і ў цэлым па фарміраванні светапогляду міжнароднага супрацоўніцтва ў вырашэнні навуковых і тэхнічных задач. У 1980 годзе было прынята рашэнне Пятра Машэрава (першы сакратар ЦК КП Беларусі) і Аляксандра Аксёнава (старшыня Савета Міністраў рэспублікі) аб стварэнні Аб'яднання парашковай металургіі. Нас вывелі з падпарадкавання вышэйшай школы (з БПІ) і падпарадкавалі Савету Міністраў напрамую. Гэта быў вельмі важны крок з пункту гледжання кіравання.

Гэта дазволіла ў сціслыя тэрміны вывесці нашу матэрыялазнаўчую базу на значныя вышыні, якія мы займаем сёння. У саюзных касмічных праграмах СССР наша рэспубліка ўдзельнічала па шэрагу кірункаў — матэрыялазнаўства, інфармацыйных тэхналогій, оптыкі, электронікі. Усё кіраванне, вядома ж, ішло праз Маскву. Такім чынам, многія інстытуты рэспублікі, у тым ліку і наша аб'яднанне, былі актыўна ўцягнутыя ў праграмы па асобных практычных задачах — ва ўзаемадзеянні з прадпрыемствамі саюзнага машынабудавання, а пасля 1991 года — з «Раскосмасам».

Само нічога не рабілася і дарма не давалася. Трэба было сустракацца, пераконваць, ставіць сур'ёзныя сумесныя задачы і годна выконваць іх на практыцы. У выніку з развіццём саюзнай беларуска-расійскай касмічнай кааперацыі саспела асяроддзе і для вырашэння іншых высокатэхналагічных задач, якія неабходныя для перадавых галін нашай індустрыі: атамная энергетыка, біятэхналогіі, оптыка, электроніка і многія іншыя.

***— Калі вы адчулі магчымасць і жаданне заняцца менавіта касмічнай праграмай?***

— У канцы 1990-х гадоў — пачатку 2000 года, калі наша эканоміка трохі акрыяла ад разрыву саюзных сувязяў, — пачалі гаварыць пра тое, каб асвойваць космас самастойна. Тады пасаду старшыні Прэзідыума Акадэміі навук займаў Міхаіл Мясніковіч. Ён і падняў пытанне аб вырашэнні асабліва значных, маштабных задач. Адной з іх стала развіццё касмічнай тэхнікі. Што трэба ў першую чаргу, каб зрабіць спадарожнік ва ўмовах сучасных касмічных тэхналогій, якія бурна развіваюцца? Адказ дя нас ляжаў на паверхні: ствараць новыя матэрыялы, новую оптыку, новую электроніку. І ўсё гэта распрацоўвалася і выпрабоўвалася на ўласнай базе, у інстытутах НАН Беларусі, на ААТ «Пеленг», ААТ «Інтэграл». Распрацаваныя матэрыялы, тэхналогіі, узоры тэхнікі можна выкарыстоўваць як для касмічных мэт, так і ў іншых галінах. На гэтым і робіцца эканоміка. Міхаіл Мясніковіч дакладваў Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку і пераканаў яго ў тым, што рэспубліцы трэба ствараць свой спадарожнік. Усе ў Акадэміі навук падтрымалі гэты кірунак як адзін з найважнейшых, узяліся за работу. Спачатку я ўдзельнічаў у касмічнай праграме як вучоны-матэрыялазнавец. Тады расійскае РКК «Энергія» вырабіла добры спадарожнік — БелКа, але яго запуск летам 2006 года на Байкануры аказаўся няўдалым з-за аварыі ракеты-носьбіта «Днепр». Пасля гэтага Прэзідэнтам было прынята рашэнне ствараць другі, больш дасканалы спадарожнік — беларускі касмічны апарат дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі (БКА). Тады я быў прызначаны адказным за выкананне гэтай задачы і пачаў мэтанакіравана займацца тэматыкай стварэння нацыянальнага аэракасмічнага комплексу, які ўключае шматузроўневую сістэму дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі (як касмічную, так і паветраную, наземную), сістэмы кіравання спадарожнікам і прыёму касмічнай інфармацыі, яе апрацоўкі і выкарыстання для розных мэт сумесна з зацікаўленымі галінамі. Галоўным канструктарам Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з'яўляецца Сяргей Залаты. З расійскага боку спадарожнікавай праграмай кіраваў генеральны дырэктар АТ «Карпарацыя «УНДІЭМ» (у складзе «Раскосмаса») Леанід Макрыдзенка. Дарэчы, у яго беларускія карані.



НДІ парашковай металургіі напярэдадні прыняцця рашэння аб стварэнні Рэспубліканскага аб'яднання, у цэнтры — Пётр МАШЭРАЎ і Алег РОМАН, 1980 год.

У цяперашні час на арбіце паспяхова працуе створаная сумесна з Расіяй група спадарожнікаў «Канопус В» і наш «БКА» (запуск быў ажыццёўлены 22 ліпеня 2012 года). Мы можам кіраваць іх спадарожнікам, яны — нашым. Мы таксама распрацавалі добрае матэматычнае і праграмнае забеспячэнне. Сёння створана індустрыя, падабраныя кадры, якія могуць кіраваць гэтым альянсам, вывучаць і ўплываць на яго далейшы лёс. Натхнёўшыся агульным поспехам, абодва бакі прыйшлі да думкі аб стварэнні новага спадарожніка. Тым больш што наш апарат адпрацаваў свой гарантыйны тэрмін. Але, дзякуючы досведу і ведам нашых і расійскіх інжынераў і навукоўцаў, мы прадоўжылі работу спадарожніка на два гады. Гэта найважнейшае дасягненне нашых спецыялістаў, пакуль не цалкам усвядомленае і ацэненае ў грамадстве. Спадзяёмся, што зможам прадоўжыць работу спадарожніка яшчэ на два-тры гады.

Калі сёння наш спадарожнік працуе з аптычным раздзяленнем у два метры, то новы апарат зможа працаваць у дыяпазоне менш за адзін метр. Такой камерцыйнай прадукцыі на сусветным рынку пакуль няма. Ёсць спадарожнікі спецыяльнага прызначэння з гэтым раздзяленнем, ваенный тэматыкі, але яны важаць шэсць тон і больш. Мы ж гатовыя зрабіць лёгкі — вагой да адной тоны. Тэхналогіі ж не стаяць на месцы. Ужо ўсё падрыхтавана, і ёсць дамоўленасць на ўзроўні прэзідэнтаў і ўрадаў аб стварэнні новага беларуска-расійскага спадарожніка дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Гэты спадарожнік і інавацыйны, і экспартаарыентаваны. Такой прадукцыі на сусветным рынку пакуль яшчэ вельмі мала. Але варта нам памарудзіць з яго запускам некалькі гадоў — і яны з'явяцца з лішкам, і тады мы не будзем канкурэнтаздольныя. Плануецца, што па гэтым праекце адну трэць фінансуем мы, а астатняе Расія. Платформа і запуск — расійскія, а мэтавая апаратура спадарожніка — нашай вытворчасці. Мы, са свайго боку, каб не губляць час, пачалі ўжо працаваць. І гэта нягледзячы на тое, што фінансаванне пакуль не адкрыта.

***— А ў рамках Еўразійскага супрацоўніцтва?***

— Так, мы пайшлі па шляху супрацоўніцтва ў рамках ЕАЭС і прапанавалі стварыць спадарожнік ЕАЭС. Ёсць і платформа, і тэхнічныя патрабаванні выкладзены. Усе гатовыя, але пакуль на стадыі папярэдніх дамоўленасцяў. Хоць гэта было б вельмі выгадна для ўсіх дзяржаў Еўразійскага саюза. Спадарожнік пралятае над адным пунктам зямной паверхні адзін раз на два тыдні. Трэба мець як мінімум шэсць спадарожнікаў у групе. Гэта дазволіць аператыўна маніторыць становішча на Зямлі. Асабліва гэта важна пры надзвычайных сітуацыях і вырашэнні шматлікіх практычных задач для многіх галін. Не толькі выяўляць своечасова значныя змены, але і адсочваць іх дынаміку, кірункі, каб эфектыўна ўплываць на іх. Увесь свет сёння развіваецца ў гэтым кірунку.

Касмічная тэхніка і тэхналогіі з'яўляюцца тым лакаматывам, які рухае развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі. Нядаўна на II З'ездзе вучоных Беларусі з удзелам Прэзідэнта краіны была прынятая стратэгія развіцця навукі і тэхналогій да 2040 года, якая ўключае сярод прыярытэтных кірункаў і развіццё касмічнай галіны.



Адказныя прадстаўнікі Федэрацыі касманаўтыкі Расіі і ўрадавай дэлегацыі Беларусі на касмадроме Байканур каля асновы ракеты-носьбіта «Саюз-Фрэгат» напярэдадні паспяховага запуску беларускага спадарожніка, 2012 год.

**Гутарыў Ігар САМОЙЛАЎ** ■

■ Абітурыент-2018

# Бясплатная «рэпетыцыя» на дыстанцыі

**З 1 лютага абітурыенты змогуць прайсці дыстанцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне праз інтэрнэт, не выходзячы з дому ці з навучальнай установы! Здача тэста ў дыстанцыйнай форме будзе бясплатная.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў будзе створаны раздзел «Дыстанцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне», у якім размесцяць па адным варыянце тэстаў па 15 вучэбных прадметах.

Для набліжэння да рэальных умоў здачы ЦТ на сайце РІКВ падчас выканання тэста можна будзе кіравацца часам, які адводзіцца на пэўны прадмет. Тыя, хто захочуць проста адпрацаваць тэхналогію экзамену, змогуць не абмяжоўваць сябе часавымі рамкамі. Акрамя гэтага, электронны бланк адказу можна будзе раздрукаваць, запоўніць, а пасля занесці ўсе пазіцыі з папяровага носьбіту ў электронную версію.

Вынікі тэстаў абітурыенты атрымаюць адразу пасля іх выканання, не пакідаючы сайта РІКВ. У дадатак яны атрымаюць матэрыялы тэматычнага кансультавання, якія ўключаюць само заданне, яго рашэнне і (або) каментарый да яго, правільны адказ і спасылку на падручнік ці вучэбны дапаможнік з указаннем параграфа, у якім выкладзены гэты вучэбны матэрыял. Для набыцця навыкаў запаўнення бланка і недапушчэння тэхнічных памылак пры афармленні адказаў на ЦТ у раздзеле «Дыстанцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне» таксама будуць прыведзены ўзоры бланка адказаў і відэаролік з падрабязнай інструкцыяй па яго запаўненні.

Хоць на дыстанцыйнае тэсціраванне і выносіцца толькі адзін варыянт тэста, але трэніравацца на ім можна будзе столькі разоў, колькі абітурыенту патрэбна (з лютага да канца мая). Да таго ж бясплатна прайсці дыстанцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне дазваляецца па ўсіх 15 дысцыплінах ЦТ.

Цяпер у краіне праходзіць другі этап платнага бланачнага рэпетыцыйнага тэсціравання, а ў сакавіку стартуе трэці. Такім чынам, да старту прыёмнай кампаніі ў абітурыентаў ёсць магчымасць «адрэпеціраваць» будучы экзамен яшчэ некалькі разоў

■

■ Рэйтынгі

# КРОК НАПЕРАД

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт упершыню ўвайшоў у топ-500 лепшых універсітэтаў у сусветным рэйтынгу ўніверсітэтаў «Webometrics Ranking of World Universites» (WRWU).**

Рэйтынг WRWU ўжо больш як дзесяць гадоў складаецца іспанскай даследчай лабараторыяй «Laboratorio de Internet» і абнаўляецца два разы на год: у студзені і ліпені.

У рэдакцыі рэйтынгу за студзень 2018 года БДУ заняў 487-е месца, падняўшыся на 19 пазіцый у параўнанні з папярэднім паказчыкам (у ліпені 2017 года — 506 месца). Усяго ў рэйтынгу WRWU ўлічваюцца звесткі 27 тысяч ВНУ, а ў свеце іх — больш за 30 тысяч. Лідзіруюць па традыцыі Гарвардскі і Стэнфардскі ўніверсітэты, а таксама Масачусецкі тэхналагічны інстытут.

Сярод універсітэтаў краін СНД Белдзяржуніверсітэт заняў другую пазіцыю, саступіўшы толькі Маскоўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя М. В. Ламаносава (235-е месца), і ўпершыню абышоў у рэйтынгу Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (у яго 491-е месца).

Сярод беларускіх ВНУ ў рэйтынгу Webometrics Белдзяржуніверсітэт захоўвае першынство. Другое месца займае Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт: у яго 2955-я пазіцыя. На трэцім месцы — Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце (2972), на чацвёртым — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (3359-я пазіцыя), а замыкае пяцёрку Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі (3544-е месца).

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

**Минский филиал РУП «Белпочта» приглашает принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для выполнения работ по разовому техническому обслуживанию на объектах Слуцкого РУПС:** «Разовое техническое обслуживание в ОПС Леньки, Ленино, Танежицы, Гольчичи, Козловичи, Гацук, Лядно, Селище, Подлесье, Исерно, Мусичи». Предложения для переговоров принимаются с 14.00 31 января 2018 года до 17.15 2 февраля 2018 года в кабинете 216 в здании Минского филиала по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3. Источник финансирования работ – собственные средства предприятия. По всем вопросам обращаться по тел. 264 83 66 – начальник отдела ЭЗиС Иванов И. В. УНП 101120215

В связи с присоединением РУП «Служба ведомственного контроля при Минстройархитектуры» к РУП «Белстройцентр» (Приказ Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 26.12.2017 № 273) ликвидируется Первичная профсоюзная организация РУП «Служба ведомственного контроля при Минстройархитектуры». УНП 102293845

**Гайненский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по изготовлению документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Беланы, ул. Березовая, уч. № 1, кадастровый номер 623280800801000043 | 0,1451 | Подъездные пути удовлетворительные | 6000,00 | 1200,00 | 1409,99 |
| 2 | д. Селец, ул. Озерная, 42, кадастровый номер 623280811201000073 | 0,1500 | Подъездные пути удовлетворительные | 5000,00 | 1000,00 | 1875,79 |

**Аукцион проводится 01.03.2018 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, 2, Логойского района, Минской области, здание Гайненского сельского исполнительного комитета. Документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, до 26 февраля 2018 года (последний день подачи документов – 23.02.2018 г. до 17.00) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, 2, Логойского района, Минской области.**

Задаток перечисляется на р/с № BY60AKBB36006190211080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X г. Минск, код 795, ОКПО 04431493,УНН 600537220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату земельного участка и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Контактные телефоны: 801774-56436, 56498

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Октябрьского (г. Минска) межрайонного отдела управления по г. Минску и Минской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

| Сведения о предметах торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка (10 % от начальной цены), бел. руб. | Контакт для осмотра объекта |
| 1 | Не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение (административное здание с помещениями общественного питания), общей площадью 4 138,7 кв. м, расположенное на месте реконструкции здания ватного цеха и бензохранилища, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000003003794, площадь 0,1314 га, по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5. **Примечание:** десятиэтажное, земельный участок предоставлен на праве аренды. **Особые сведения:** имущество должника. Уполномоченный орган – ИМНС Республики Беларусь по Ленинскому району г. Минска | 3 682 800,00 бел. руб. | 368 280,00 бел. руб. | Начальник отдела ИМНС Республики Беларусь по Ленинскому району г. Минска – Бутрим Сергей Иванович, тел. 8 029 697 21 29, пн. – пт. с 09.00 до 18.00 |
| 2 | Изолированное помещение транспортного назначения – гараж 95 с инв. № 500D-38410, общей площадью 33,6 кв. м, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Корженевского, 20В, пом. 95. **Примечание:** гараж с подвалом в гаражно-строительном потребительском кооперативе «Курасовщина-4» | 8 748,00 бел. руб. | 874,80 бел. руб. | 8 029 562 79 63 |

**Задатки в размере 10 % от начальной цены объектов перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015 ОКПО 29250255, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» не позднее 28.02.2018 г.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) **в течение 3 рабочих дней** со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Подробный порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях их проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **05.03.2018 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по указанному адресу. Окончание приема заявлений: **28.02.2018 в 16.00. Телефоны: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | – капитальное строение, инв. № 420/С-47003 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, назначение – здание свинарника), общей площадью 965,1 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 1, свинарник западнее д. Реклевцы; – капитальное строение, инв. № 420/С-46824 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, назначение – здание бани), общей площадью 51,1 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 1/1, баня западнее д. Реклевцы; – капитальное строение, инв. № 420/С-46832 (назначение – здание специализированное животноводства, назначение – здание зерносклада), общей площадью 213,5 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 1/2, зерносклад западнее д. Реклевцы; – капитальное строение, инв. № 420/С-46827 (назначение – здание специализированное животноводства, назначение – здание подсобного помещения), общей площадью 60,1 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 1/3, подсобное помещение западнее д. Реклевцы; – капитальное строение, инв. № 420/С-48379 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, назначение – водонапорная башня), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 1/4, водонапорная башня западнее д. Реклевцы; – капитальное строение, инв. № 420/С-46976 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, назначение – водопроводная сеть), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, водопроводная сеть к свинарнику западнее д. Реклевцы; – капитальное строение, инв. № 420/С-48380 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, назначение – артезианская скважина), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 13, артскважина 300 м юго-западнее д. Реклевцы |
| Земельный участок, на котором расположен объект | – кадастровый № 423685200062000006, площадью 0,9947 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений хозяйственного двора), расположенный по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, 1, свинарник западнее д. Реклевцы. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в водоохранных зонах, прибрежных полосах водных объектов, зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для питьевого водоснабжения, водоохранных и защитных лесов, охраняемых типичных и редких природных ландшафтов, код – 4, площадью 0,9947 га; земли, имеющие ограничения по строительству, благоустройству и тому подобное, код – 13, площадью 0,0550 га; земли, имеющие ограничения по строительству, благоустройству и тому подобное, код – 13, площадью 0,0017 га. – кадастровый № 423685200062000007, площадью 0,0498 га (назначение – для обслуживания артезианской скважины), расположенный по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, в районе д. Реклевцы |
| Начальная цена продажи | 23 892 руб. (двадцать три тысячи восемьсот девяносто два рубля) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2 389 руб. (две тысячи триста восемьдесят девять рублей) |
| Продавец | ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8 0154 65-25-01, факс 8 0154 65-25-60 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 1 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 26 февраля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*Дополнительная информация http://grodnoino.by*

# ТАКАЯ НЕАДНОЛЬКАВАЯ ВАЙНА

## Як паказаны падзеі Другой сусветнай у школьных падручніках розных краін

**Старшыня Пермскага краявога аддзялення супольнасці «Мемарыял» Роберт ЛАТЫПАЎ, які прывёз у Мінск выставу «Розныя войны...», сцвярджае, што, калі параўнаць нацыянальныя вучэбныя дапаможнікі па гісторыі той вайны, увогуле складваецца ўражанне, што размова ідзе пра зусім не падобныя адзін да аднаго ўзброеныя канфлікты...**


З матэрыяламі выставы азнаёміліся замежныя дыпламаты.

Яшчэ са школьнага ўзросту мы ведаем, што Другая сусветная вайна пачалася 1 верасня 1939 года. У Чэхіі ж, калі верыць тамтэйшым падручнікам, — на год раней: у выніку падпісання Мюнхенскага пагаднення. А ў італьянскай гістарыяграфіі, увогуле, Другая сусветная вядзе свой летапіс з 1935 года, калі італьянцы ўварваліся на тэрыторыю Эфіопіі.

Такія ж розныя прачытанні падзей найбуйнейшага кровапралітнага ўзброенага канфлікту чалавецтва ў дапаможніках Германіі, Італіі, Літвы, Польшчы, Расіі...

— Экспазіцыя будзе актуальная пяць — максімум дзесяць гадоў: падручнікі па гісторыі пастаянна мяняюцца, — адзначае куратар выставы Роберт Латыпаў. — І гэта нармальна: ідзе час, змяняюцца падыходы, ды і, што хаваць, палітычная кан'юнктура — таксама. Але сёння ў нас ёсць унікальны шанц паглядзець, якую гісторыю дарослыя хочуць падносіць маладому пакаленню.

Па меркаванні **пасла Італіі ў нашай краіне Стэфана Б'ЯНКІ,** гісторыя ў гэтым выпадку з'яўляецца не толькі адукацыйным і выхаваўчым прадметам, а і той матэрыяй, якая фарміруе свядомасць і светаўспрыманне. «Гэта прадмет, які знаходзіцца ў пастаянным развіцці і асэнсаванні, таму вельмі важны момант сумеснага разважання над падручнікамі, дзе ідзе гаворка пра адну і тую ж падзею», — лічыць дыпламат.

Выстава, падрыхтаваная працоўнай групай «Гістарычная памяць і асвета» Грамадзянскага форуму ЕС — Расія, ужо пабывала ў васьмі гарадах Расіі. Англамоўная версія з поспехам была прэзэнтавана ў Празе, Страсбургу, Бруселі, Вільнюсе і Мілане. Сімвалічна, што ў адзін дзень яна адкрылася і ў Гістарычнай майстэрні імя Леаніда Левіна ў Мінску, і ў берлінскім музеі «Карлхорст», дзе 8 мая 1945 года быў падпісаны Акт аб капітуляцыі Германіі, які завяршыў Вялікую Айчынную вайну.

— Паколькі школьныя падручнікі ўтрымліваюць веды, якія адно пакаленне імкнецца перадаць іншаму, яны часта становяцца палітычным інструментам, — перакананы **пасол Германіі ў Беларусі Петэр ДЭТМАР.** — Падручнікі па гісторыі могуць падтрымліваць варожасць і забабоны і ў той жа час спрыяюць прымірэнню і ўзаемаразуменню. Абмен успамінамі, перш за ўсё тымі, якія супярэчаць адзін аднаму, павінен адкрыць перспектывы для агульнай будучыні.



Сваю думку пра падручнікі гісторыі выказала настаўніца мінскай гімназіі № 36 Ірына БЕРНАТ.



Частка матэрыялаў выставы нагадвае пра ахвяр вайны на тэрыторыі Беларусі.

**Пасол Чэхіі ў Беларусі Мілан ЭКЕРТ** верыць, што параўнанне адных і тых жа гістарычных падзей з розных бакоў можа дапамагчы лепшаму разуменню нядаўняга мінулага.

Адным словам, выстава дае нямала падстаў для размоў аб нашай сумеснай гісторыі. Магчымасць зазірнуць у падручнікі розных краін і пазнаёміцца з методыкамі выкладання ў іх гісторыі, прычым абсалютна бясплатна, не пазней як 28 лютага прадстаўляе Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

■

---

■ Без тэрміну даўнасці

# НОВЫ ПОГЛЯД НА БРЭСЦКУЮ КРЭПАСЦЬ

### Створаны даведнік па гісторыі цытадэлі раскрывае малавядомыя старонкі нашага мінулага

**Нягледзячы на сусветную вядомасць, Брэсцкая крэпасць паранейшаму застаецца маладаследаваным аб'ектам айчыннай культурна-гістарычнай спадчыны. Перш за ўсё пра цытадэль ведаюць у кантэксце яе гераічнай абароны ў чэрвені — ліпені 1941 года. А, між іншым, крэпасць вядзе свой летапіс з сярэдзіны XIX стагоддзя...**



Падчас прэзентацыі «Атласа крэпасці Брэст-Літоўск».

Большасць аб'ектаў на тэрыторыі сучаснага мемарыяльнага комплексу недаступны простаму погляду наведвальніка. Справа ў тым, што акрамя краязнаўцаў і людзей, якія цікавяцца гісторыяй, пра іх мала хто ведае. У прыватнасці, на тэрыторыі крэпасці знаходзяцца аб'екты, якія датуюцца нават XVII стагоддзем: той жа Бернардзінскі манастыр. Ёсць і вялікі комплекс архітэктуры XIX стагоддзя.

Ліквідаваць гэтыя белыя плямы ў гісторыі цытадэлі ўжо каторы год спрабуе Фонд развіцця Брэсцкай крэпасці. На днях убачыла свет першае навуковае выданне па гісторыі крэпасці, якое стала своеасаблівым падарункам гораду да тысячагоддзя Брэста, што будзе адзначацца ў наступным годзе.

«Атлас крэпасці Брэст-Літоўск: том 3. Фортавы перыяд» расказвае аб шматгадовай гісторыі будаўніцтва і развіцця цытадэлі. Шырокі картаграфічны матэрыял — генеральныя планы крэпасці, чарцяжы асобных умацаванняў і фотадакументы — амаль стагоддзе пад грыфам «сакрэтна» праляжаў у найбуйнейшых ваенных архівах Масквы і Санкт-Пецярбурга. Цяпер ён даступны як у папяровым варыянце, так і ў электроннай базе даных «Спадчына Брэсцкай крэпасці» (www.brestdatabase.by).


Пабываць у цытадэлі цяпер можна і з дапамогай акуляраў віртуальнай рэальнасці.

— Падчас работы над кнігай было даследавана звыш тысячы розных матэрыялаў з 10 тысяч адзінак захоўвання, — расказвае **аўтар-укладальнік «Атласа крэпасці Брэст-Літоўск» Уладзімір АРЛОЎ.** — Большая частка дакументаў, якая ўвайшла ў атлас, дагэтуль больш нідзе не друкавалася. Справа ў тым, што па розных прычынах гісторыя фарсіфікацыі канца XIX — пачатку XX стагоддзя працяглы час не вывучалася даследчыкамі.



У перспектыве Фондам развіцця Брэсцкай крэпасці будуць выдадзены яшчэ два тамы атласа, прысвечаныя гісторыі будаўніцтва крэпасці Брэст-Літоўск у межах валоў, а таксама гісторыі горада Бярэсце — сучаснага Брэста, дзе, як мы ведаем, і знаходзіцца крэпасць.

У свой час **намеснік дырэктара па навуковай рабоце мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой» Ларыса БІБІК,** якая прысутнічала падчас прэзентацыі атласа, заўважыла, што калі ў 2016 годзе Брэсцкую крэпасць наведалі прадстаўнікі больш як з 30 краін свету, то ўжо летась туды завіталі турысты са звыш 50 дзяржаў. Увогуле, за ўсе гады існавання мемарыяльнага комплексу ў цытадэлі былі жыхары са 140 краін або больш са 24 мільёны наведвальнікаў. Таксама прадстаўнік адміністрацыі паведаміла, што ў найбліжэйшы час у Брэсцкай крэпасці створаць тры новыя музеі.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

■

---

# Пачатак купалаўскай энцыклапедыі

### «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» распачала выданне энцыклапедыі «Янка Купала»




Пад адной вокладкай першага тома сабраны сотні артыкулаў на літары «А — З». Энцыклапедычныя рэдактары, літаратуразнаўцы, мастацтвазнаўцы, вучоныя іншых галін расказваюць пра ўсё, што звязана з жыццём і творчасцю народнага песняра Беларусі. Трэба нагадаць, што яшчэ ў 1986 годзе «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выдала ў адным томе энцыклапедычны даведнік «Янка Купала». Прайшло з таго часу болей як тры дзесяцігоддзі. Адбылося шмат змен у грамадска-палітычным, адпаведна — і асветніцкім жыцці нашай Айчыны. Адкрыліся многія раней забароненыя старонкі памяці пра Купалу, абставіны яго грамадскай, літаратурнай дзейнасці. З-пад цэнзурнага гнёту вызваліся імёны і творы. Як вынік — купалазнаўства набыло новыя шырокія абсягі. Гэта і з'явілася выразным штуршком да працягу работы над стварэннем энцыклапедычнага шматабсяжнага распаведу пра класіка айчыннай літаратуры. Ды і за тры дзесяцігоддзі шмат што адбылося ў прачытанні жыцця і творчасці народнага паэта ў розных галінах мастацтва — жывапісе, музыцы, скульптуры. Зусім іншым стаў Купалаўскі музей — і знешне, экспазіцыйна, і праз характар многіх новых мерапрыемстваў, праведзеных у яго сценах, з яго ініцыятывы.

Першы том энцыклапедыі «Янка Купала» шырока паказвае палітру прысутнасці паэзіі беларускага песняра ў перакладах на іншыя мовы. Доктар філалагічных навук В. Рагойша падрабязна асвятляе, напрыклад, выданне Я. Купалы «А хто там ідзе?» на мовах свету» (Мінск, 1982), у якім змешчаны пераклады неўміручага купалаўскага твора на 81 мову. У энцыклапедыі расказваецца пра перакладчыкаў Я. Купалы на рускую, казахскую, грузінскую, балгарскую, татарскую, уйгурскую, чувашскую, туркменскую і іншыя мовы — Аляксандра Алгі, Ніколу Антонава, Аўгуста Але, Акпера Аліева, Шалву Апхаідзе і інш. Асобна вылучаны тэмы: «Армянская літаратура і Янка Купала», «Англамоўны свет і Янка Купала», «Азербайджанская літаратура і Янка Купала» і інш. Пададзены артыкулы пра мастакоў, скульптараў, кампазітараў свету, якія альбо ўвасобілі вобраз Купалы ў сваёй творчасці альбо стварылі песні, араторыі, жывапісныя палотны па матывах вершаў ці паэм беларускага майстра прыгожага пісьменства. Як, напрыклад, — пра кітайскага жывапісца Ао Тэ. Першы том энцыклапедыі «Янка Купала» багата ілюстраваны — рэпрадукцыямі карцін, фотаздымкамі.

Тыраж першага тома — 1500 экзэмпляраў. Дарэчы, тады, у 1986 годзе, энцыклапедычны даведнік «Янка Купала», якім быў распачаты адлік беларускіх персанальных энцыклапедый (следам былі выдадзены кнігі пра Скарыну, Максіма Багдановіча), меў тыраж 8000 экзэмпляраў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# НА ГОРНЫХ СХІЛАХ...



## «Сонечная даліна»

Месца, якое ідэальна падыходзіць для тых, хто не валодае асабістым аўто ці не мае жадання выбірацца за межы Мінска. «Сонечная даліна» знаходзіцца ў сталіцы, у Курасоўшчыне, і мае зручную транспартную сувязь з усімі раёнамі горада. Комплекс працуе ў будныя, выхадныя і святочныя дні да 22 гадзін.

Гэтае месца наўрад ці спадабаецца прафесійным спартсменам ці вопытным аматарам, а вось для пачаткоўцаў і дзяцей падыдзе выдатна. Комплекс мае дзве трасы: асноўную (працягласць — 215 метраў, перапад вышынь — 40 метраў) і вучэбную (працягласць 125 метраў, перапад вышынь — 30 метраў), яны абсталяваны пад'ёмнікамі. У «Сонечнай даліне» таксама ёсць схіл для цюбінгаў, прадугледжаны трасы для бегавых лыжаў і працуе снаўпарк для аматараў экстрэмальнага катання.

**Дзе:** вул. Каржанеўскага, 45.

**Колькі:** дарослы скі-пас (магнітная картка, якая дазваляе прайсці праз турнікет на тэрыторыю лыжнай станцыі) — ад 15 руб./дзень, дзіцячы скі-пас — ад 8 руб./дзень.

**Пракат:** гарналыжны камплект (лыжы, палкі, абутак) — ад 9 руб./гадзіну,

снаўбордны камплект (снаўборд, абутак) — ад 9 руб./гадзіну,

бегавы лыжны камплект (лыжы, палкі, абутак) — ад 8 руб./гадзіну,

цюбінг — ад 6 руб./гадзіну.

**Паслугі інструктара:** 25 руб. за 1 чалавека ў гадзіну.

## «Сілічы»

Гарналыжны комплекс знаходзіцца на адлегласці прыкладна 32 км ад Мінска ў Лагойскім раёне. Дабрацца туды можна як на ўласным аўтамабілі, так і на аўтобусе № 350, які ходзіць штодня з ДС «Славінскага».

Комплекс падыдзе як для пачаткоўцаў, так і для вопытных аматараў спорту. У «Сілічах» чатыры гарналыжныя трасы з перападамі вышыні да 100 метраў, дзіцячая і вучэбная трасы, экстрым-парк з трамплінамі для скачкоў. Таксама сярод зімовых забаваў у цэнтры — даступныя катанні на цюбінгу, снегаходзе, а прыемным дадаткам комплексу з'яўляецца коўзанка, дзе аматары не снегу, а лёду могуць атрымаць асалоду ад катання на каньках. Працуюць тры пад'ёмнікі: два з іх абслугоўваюць гарналыжныя трасы, яшчэ адзін прызначаны для цюбінгавай трасы. Пры неабходнасці можна скарыстацца паслугамі трэнера.

З панядзелка па суботу комплекс працуе да 22 гадзін, у нядзелю да 20.00.

**Дзе:** Лагойскі раён, в. Сілічы, 32 км ад МКАД.

**Колькі:** дарослы скі-пас — ад 11 руб./гадзіну, дзіцячы скі-пас — ад 5 руб./гадзіну.

**Пракат:** бегавыя камплекты (лыжы, палкі, абутак) — ад 8 руб./гадзіну,

цюбінг — 1,5 руб./спуск, санкі — 5 руб./гадзіну.

**Паслугі інструктара:** ад 25 руб. за 1 чалавека ў гадзіну.

## «Лагойск»

Комплекс знаходзіцца на адлегласці 35 км ад Мінска і ўзвышаецца на 82 м. Акрамя ўласнага аўтамабіля дабрацца туды вам дапамогуць аўтобусы (№№ 250, 251, 350, 351 з ДС "Славінскага»), якія ходзяць кожныя 20—30 хвілін.

Другі па велічыні гарналыжны комплекс у краіне мае пяць асветленых трас з перападам вышынь 82 метры і вучэбны схіл даўжынёй 120 метраў і вышынёй 11 метраў. Трасы абсталяваны канатнай дарогай і пад'ёмнікамі.

Для аматараў бегавых лыжаў недалёка ад комплексу працуе лыжна-біятлонная база «Заячая паляна».

Аматарам затрымацца на схіле даўжэй «Лагойск» падыходзіць ідэальна — па пятніцах і суботах тут арганізаваны начныя катанні (з 22.00 да 02.00).

**Дзе:** Лагойскі раён, 37 км ад МКАД.

**Колькі:** дарослы скі-пас — ад 10 руб./гадзіну, дзіцячы скі-пас — ад 5 руб./гадзіну.

**Пракат:** гарналыжны камплект (лыжы, палкі, абутак) або снаўбордны камплект — ад 8 руб./гадзіну, цюбінг — 2 руб./спуск.

**Паслугі інструктара:** 25 руб. за 1 чалавека ў гадзіну.

## «Якуцкія горы»

Парк актыўнага адпачынку размешчаны за 37 км ад Мінскай кальцавой дарогі ў Дзяржынскім раёне. Непадалёк ад самага высокага пункта краіны — гары Дзяржынскай. Каб даехаць туды на ўласным аўтамабілі, у навігатары дастаткова ўвесці назву вёскі Якуты, а вось дабрацца да парка на іншым транспарце праблематычна.

Тут можна пакатацца на лыжах, снаўбордзе ці цюбінгу. Даўжыня трасы складае 480 метраў, перапад вышынь — 60 метраў. Ёсць канатная дарога і снегаходы. Месца падыходзіць для дзяцей і тых, хто пакуль не вельмі ўпэўнена стаіць на лыжах або снаўбордзе. Вопытным спартсменам траса магчыма здасца занадта лёгкай.

**Дзе:** Дзяржынскі раён, в. Якуты, 37 км ад МКАД.

**Колькі:** дарослы скі-пас — ад 8 руб./10 уздымаў,

дзіцячы скі-пас — 5 руб./10 уздымаў.

**Пракат:** гарналыжны камплект (лыжы, палкі, абутак) — ад 5 руб./гадзіну,

снаўборд — ад 6 руб./гадзіну, цюбінг — 10 руб./гадзіну.

**Паслугі інструктара:** 25 руб. за 1 чалавека за 1 гадзіну.

## Гарналыжны цэнтр «Веста»

Спартыўна-аздараўленчы комплекс знаходзіцца за 30 км ад Мінска па Брэсцкай трасе. Дабрацца туды можна як на ўласным транспарце, так і на электрычцы (15—20 хвілін хады да цэнтра) ці на маршрутцы. Гарналыжны комплекс па будных днях працуе да 21-й гадзіны, па выхадных — да 23.00.

«Веста» прапануе наведвальнікам тры трасы: асноўную (працягласць — 278 метраў, перапад вышынь — 37,5 метра), навучальную (працягласць — 259 метраў, перапад вышынь — 29,5 метра) і трасу для цюбінгаў. Усе спускі аснашчаны пад'ёмнікамі.

Таксама на тэрыторыі комплексу ёсць траса для бегавых лыжаў, каток, кафэ і лазні, саўна. «Веста» — добры варыянт адпачынку для сем'яў і лыжнікаў-пачаткоўцаў.

**Дзе:** Дзяржынскі раён, 319-ы км трасы Мінск—Брэст (М1), 30 км ад МКАД.

**Колькі:** скі-пас — ад 16 руб./дзень.

**Пракат:** гарналыжны камплект (лыжы, палкі, абутак) — ад 7 руб./гадзіну,

снаўбордны камплект (снаўборд, чаравікі) — ад 6,5 руб./гадзіну,

цюбінг — ад 7 руб./гадзіну,

канькі — ад 4 руб./гадзіну.

**Паслугі інструктара:** 22 руб. за 1 чалавека за 1 гадзіну.

## «Раўбічы»

Цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту прызначаны перш за ўсё для падрыхтоўкі прафесійных спартсменаў, а для аматараў «Раўбічы» прапаноўваюць трасу для бегавых лыжаў і біятлона, а таксама крыты каток.

**Дзе:** Мінскі раён, Астрашыцкі гарадок, 14 км ад МКАД.

**Колькі:** лыжныя гонкі — 32 руб./дзень, біятлон — 33 руб./дзень.

**Пракат:** бегавыя лыжы і абутак — ад 6 руб./гадзіну.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БЕЛАРУСЫ ЗАМАЦОЎВАЮЦЦА Ў АНТАРКТЫДЗЕ

**Напярэдадні Дня беларускай навукі ў Антарктыдзе ўведзены ў эксплуатацыю тры новыя аб'екты нацыянальнай даследчай станцыі і чарговым супрацоўнікам перададзены сімвалічныя ключы ад сучасных навуковых лабараторый, службовых і жылых памяшканняў. Такое паведамленне прыйшло ў Акадэмію навук з Паўднёвага полюса Зямлі, дзе зараз працуе 10-я Беларуская антарктычная экспедыцыя.**

Члены яе каманды ў найскладанейшых кліматычных і прыродных умовах правялі мантажныя і пусканаладачныя работы для далейшага развіцця беларускай палярнай інфраструктуры.

«Рэспубліцы Беларусь, калектыву Нацыянальнай акадэміі навук, усім беларускім навукоўцам і інжынерным спецыялістам ёсць чым ганарыцца: стварэнне Беларускай антарктычнай станцыі без перабольшання можна лічыць паспяховым нацыянальным праектам, які не саступае па навізне навукова-тэхнічных рашэнняў і ўмовах рэалізацыі праектам па стварэнні арбітальных навуковых станцый. Пры яе праектаванні і будаўніцтве знайшлі практычнае ўвасабленне перадавыя айчынныя навуковыя ідэі, смелыя інжынерныя рашэнні, і ствараецца яна — рукамі беларусаў!

Паважаныя калегі, дарагія сябры! Жадаем вам моцнага палярнага здароўя, дабрабыту, плённай працы, увасаблення ў жыццё новых навуковых ідэй і адкрыццяў у інтарэсах нашай краіны і сусветнага навуковага прагрэсу!»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



■ Будзь у курсе!

# У АЭРАПОРТ — ПА ДАЗВОЛЕ

Устаноўлены патрабаванні да работы там таксістаў

**Гэта зроблена ў дачыненні да кантраляванай тэрыторыі прывакзальнай плошчы Нацыянальнага аэрапорта Мінск, адпаведная інфармацыя размешчана на сайце аэрапорта. Патрабаванні ўжо ўступілі ў сілу з раніцы 23 студзеня.**

Як растлумачылі ў прэс-службе аэрапорта, было зацверджана палажэнне аб парадку выдачы пісьмовай згоды аўтаперавозчыкам на аказанне паслуг па перавозцы пасажыраў на тэрыторыі прывакзальнай плошчы, падставы і парадак выдачы такой згоды. Працаваць на тэрыторыі аэрапорта змогуць толькі тыя перавозчыкі, якія атрымалі дазвол. Згодна з дакументам, для работы на тэрыторыі аэрапорта допускаюцца аўтамабілі, што адпавядаюць наступным крытэрыям: не старэйшыя за 10 гадоў; тэхнічна спраўныя ў аб'ёме пытанняў, якія правяраюцца пры праходжанні ДТА; якія маюць рэгістрацыйныя знакі жоўтага колеру, аформленыя ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў Беларусі.

Кіроўца павінен адпавядаць шэрагу крытэрыяў: мець ахайны знешні выгляд, павінен быць апрануты ў афіцыйна-дзелавым стылі, забяспечваць культурнае абслугоўванне пасажыраў, быць ветлівы і добразычлівы з пасажырамі і прадстаўнікамі аэрапорта.

Нацыянальны аэрапорт Мінск пакідае за сабой права адмовіць у выдачы пісьмовай згоды, калі аб'ём попыту на паслугі па аўтаперавозках перавышае магчымасці стаянкі, спецыяльна абсталяванай для размяшчэння аўтамабіляў таксі, г. зн. будуць адсутнічаць вольныя месцы. Дзеянне дакумента не распаўсюджваецца на аўтамабільных перавозчыкаў, якія ажыццяўляюць перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах, а таксама тых перавозчыкаў, якія пачалі перавозку пасажыраў па-за межамі кантраляванай тэрыторыі прывакзальнай плошчы аэрапорта.

Пісьмовая згода на аказанне паслуг выдаецца на кожны канкрэтны аўтамабіль на тры месяцы. Атрыманне гэтага дазволу бясплатнае.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Кінакрокі

# АЙЦІШНІК, СЕЛЬСКІЯ ДАКТАРЫ І МАРЫ АБ ЕЎРАБАЧАННІ

## У пракат хутка выходзіць новы беларускі фільм ад аўтара працягу «Белых рос»

**Тых, хто дагэтуль уяўляе беларускае кіно ў вобразе «партызанфільма», новая карціна Аляксандры Бутар «У асабістую прастору ўваход забаронены» мусіць прыемна здзівіць. Тых, хто з творчасцю рэжысёркі ўжо знаёмы — з поўнаметражнымі стужкамі «Белыя росы. Вяртанне» і «Салодкае развітанне Веры», — не здзівіць нічога. Тыя, хто крыху ведаюць сучасны беларускі кінапрацэс і дыскусіі ўнутры яго, убачаць у выхадзе трэцяй работы Аляксандры Бутар пэўны прэцэдэнт. 1 лютага фільм «У асабістую прастору ўваход забаронены» выйдзе ў пракат — на экране разгорнуцца тры гісторыі кахання і выдатная прэтэнзія цяпер ужо незалежнага аўтара на вялікае кіно.**

Карціна створана ў жанры рамантычнай камедыі, то-бок належыць сегменту масавых фільмаў для лёгкага, ненапружанага вечара, з якімі можна пасмяяцца і натхніцца, дзеля якіх можна запрасіць дзяўчыну на апошні рад кінатэатра. Беларускаму кінематографу не хапае шмат чаго, але «лёгкага» відовішча, напэўна, не хапае адчайна, бо ні ідэалагічнае кіно, ні аўтарскія інтэнцыі не могуць зацікавіць масавага гледача, звярнуць яго ўвагу на беларускіх рэжысёраў, да якіх усталяваўся заслужаны недавер, і ўнесці ў выніку ўклад у развіццё індустрыі.

Якраз усе тры фільмы Аляксандры Бутар (два першыя былі зняты на кінастудыі «Беларусьфільм») займаюць гэту няцесную нішу, успамінаючы таксама сумесныя беларуска-расійскія праекты «Вось гэта каханне!» і «З 8 сакавіка, мужчыны!», апроч іх актуальныя камедыі, якія могуць паслужыць тым жа мэтам, здымае Андрэй Курэйчык. На маёй памяці гэта пакуль усё, прычым расцягнута ў часе на некалькі гадоў: адным словам, беларускі гледач «лёгкімі» фільмамі айчыннай вытворчасці не распешчаны.

Але фармат кіно для масавага гледача не прадугледжвае паслаблennя па крытэрыях якасці, а якасць — краевугольны камень для ўсіх названых мэт, як зацікавіць гледача, вярнуць давер да айчыннага кінапрадукта, развіць індустрыю і дасягнуць іншых прыемных эфектаў. І вось тут мы вяртаемся да фільма «У асабістую прастору ўваход забаронены», які шмат у чым прама наследуе дзвюм папярэднім работам Аляксандры Бутар, і спрабуем зразумець, ці не расчаруецца глядач у беларускім кіно яшчэ больш?

Карціна расказвае пра маладога, паспяховага і сімпатычнага айцішніка Макса, выхаванага ў строгіх традыцыях перфекцыянізму. Яго імкненне да ідэалу настолькі моцнае, што выхад камп'ютарнай гульні, у якой распрацаваны галоўным героем танк не даварочвае дула на два працэнты, прымушае Макса ўсё кінуць і з незразумелымі намерамі з'ехаць у глуш, аддаць ключы ад машыны выпадковаму хлопцу і сесці на лавачку на чыгуначнай станцыі «Лясное», дзе ён сустракае энергічную і непасрэдную дзяўчыну ў белай сукенцы. Мы назіраем, як механічна і з раздражненнем ён аб нечым дамаўляецца, як абыякава прымае рашэнні, як мучыцца сумненнямі. Карацей, інтрыга аб яго намерах, калі яна застаецца інтрыгай, трымаецца да слязлівага моманта пад песню гурта «Тяни-толкай» — тут мы павінны зразумець драматызм сітуацыі, замерці ў чаканні і адчуць эмацыянальную напружанасць.



Павінны па азначэнні — згодна са схемай, па якой аўтары ствараюць фільм, — але праблема ў тым, што жаданыя эмоцыі работа «У асабістую прастору ўваход забаронены» выклікаць не здольная. Мы бачым і разумеем драматургічную структуру, за кошт чаго павінна трымацца інтрыга, дзе глядач мусіць дасягнуць піку суперажывання, а сэрца — спагадліва ёкнуць. Карацей, зразумела, якога эфекту хоча дасягнуць рэжысёр, але ўсё гэта не працуе з-за, па-першае, тэхнічных момантаў, па-другое, сцэнарыя, па-трэцяе, сэнсу таго, што тут адбываецца і агучваецца.

Дрэнны гук з'ядае важкую частку дыялогаў, не хапае фонавых шумоў, дзейнічаюць тут не героі, а тыпажы, мантаж зроблены быццам спехам, для эмоцый гледача не хапае канцэнтрацыі на эмоцыях персанажаў, хоць бы праз буйныя планы, дынаміка дазваляе засумаваць, калі не заснуць.

Дарэчы, у сюжэце задзейнічаны яшчэ дзве пары: мясцовая доктарка з малодшым за яе фельчарам, што пачынае сваю кар'еру ў медыцыне, і дачка ўладальніка кавярні з іх работнікам, што хоча «прадзюсаваць» дзяўчыну, каб тая трапіла на Еўрабачанне. Не трэба казаць, што гісторыі ўсіх трох пар, нягледзячы на перыпетыі, скончацца хэпі-эндам. Але што гэта за перыпетыі, дзе матывацыя асобных дзеянняў, чаму ўсё так ненатуральна фарсіруецца?

Напэўна, праз жаданне галоўнага героя ўсё кінуць з-за двух працэнтаў, на якія не даварочваецца дула танка ў камп'ютарнай гульні, павінен быў быць створаны пэўны абсурд, але эстэтыка абсурду нікя не ўпісваецца ў сентыментальныя перажыванні Макса з-за таго, што ў дзяцінстве ён не выратаваў дзяўчынку ад хуліганаў. Значыць, сцэнарысты ставяцца да гэтай псіхалагічнай траўмы сур'ёзна, але ў стужцы яна выглядае карыкатурна, надумана, нарэшце непераканаўча.

Непераканаўчасць — якасць карціны «У асабістую прастору ўваход забаронены» ў цэлым. Я гатова прымаць законы існавання ўнутры таго ці іншага фільма, але яны для гэтага павінны быць доказнымі, выразнымі, звязанымі паміж сабой. Тут жа большасць падзей выклікае пытанні: чаму ўладальнік кавярні забараняе свайму работніку мець стасункі са сваёй дачкой (варта было даць намёк, якім крытэрыям гэты хлопец не адпавядае), як доктар ставіцца да свайго малодшага калегі і ці варта ўспрымаць секс паміж імі як нешта сур'ёзнае (і чаму доктар псіхуе), што затрымлівае гэту жыццярадасную дзяўчыну ў белай сукенцы на прыпынку так надоўга. Канешне, кожная сцэна быццам упісваецца ў больш шырокі кантэкст і стварае перыпетыі, каханне і «іскрамётныя» жарты, але кожнай пажадана мець пад сабой сэнсавы падмурак.

Гумар карціны заслугоўвае асобнай увагі. Дзіўна, што за смешнае ўсё яшчэ падаецца, калі нехта некага памылкова прымае за гомасексуаліста, яшчэ і баіцца агучыць гэта слова. Альбо рухі чалавека, які хоча ў прыбіральню. Ці сітуацыя, калі фельчар не можа памерыць ціск, таму што «пацыент» не супакойваецца. Над усім гэтым глядач быццам павінен смяяцца, але камедыя не адбываецца, таму што кожнай сцэне не хапае пэўных інгрэдыентаў — альбо адпаведнага выканання, альбо актуальнасці, альбо самой гумарыстычнай асновы.

У гумарыстычным складніку, як і ва ўсёй карціне, бачны ўплыў гатовых трафарэтаў. Трэці фільм падобна «Белым росам» і «Салодкаму развітанню Веры», карыстаецца запазычанымі формамі, спрабуючы адаптаваць іх пад сваё кіно, але атрымліваецца звычайны набор штампаў — прычым з не лепшых першакрыніц — з рэзнымі паміж сабой сувязямі.

Мяркуючы па трох прагледжаных фільмах Аляксандры Бутар, я бачу толькі жаданне здымаць кіно, а жадання спасцігнуць спосабы яго здымаць, а тым больш яго магію і здольнасці кінамовы пакуль не відаць.

Трэба прызнаць, рамантыка, жарты і «соплі» ў кінатэатры нам — гледачам сапраўды патрэбны, але патрэбны і трывалая драматургічная база, пераканаўчасць, свабода ад шаблонаў, упэўненая акцёрская гульня, добры гук. Калі масавага прадукту беларускаму кінематографу не стае, асаблівая шкада, калі гэту нішу прадстаўляюць няўпэўненыя прэтэнзіі на вялікае кіно. Ці здольна «Асабістая прастора» вярнуць гледача беларускім фільмам? Хіба што даказаць, што сферай яго інтарэсаў можа быць сучасны свет (бо большасць гэтага ўсё яшчэ не ведае).

Але ўбачыць фільм я б усё ж раіла тым, каго зацікавяць наступныя аргументы: папершае, гэта поўнаметражны незалежны беларускі фільм, у якім мы можам убачыць знакі свайго асяроддзя, а па-другое, гэта лёгкая камедыя пра каханне, разам з якой можна калі не пасмяяцца і натхніцца, то хоць бы правесці ненапружаны вечар.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Выстаўка

# ДЫНАСТЫЯ: ПА-ЗА БЕЛЫМ І ШЭРЫМ

## СВЯТЛО АД СЯМ'І ІВАНОВЫХ

**Мастацкае асяроддзе Мінска дазваляе не губляць святочны настрой: у галерэі «Арцель» пачала работу выстаўка жывапісу Рыгора, Наталлі, Галіны і Дар'і ІВАНОВЫХ «Святло Раства».**



Праект размеркаваны па дзвюх залах выставачнай прасторы. Спачатку вы трапіце ў казачную атмасферу белай залы, дзе прадстаўлены мастацкія кампазіцыі Наталлі, Галіны і Дар'і Івановых. Наталля стварае паэтычныя і ўзнёслыя мастацкія творы. Яе работы, нібыта чароўныя сны, у якіх ты можаш затрымацца нават пасля прагляду выстаўкі. Мастачка абуджае ў чалавеку ўнутранае дзіця, у якім жыве творчы пачатак.

Творы дзяўчат Галіны і Дар'і зусім іншыя. Маладыя аўтаркі больш засяроджваюцца на рэальнасці. Але праз сваю творчасць яны імкнуцца патрапіць у свет нерэальны, чароўны, загадкавы, які існуе паралельна з нашым. Дзяўчаты шукаюць для сябе новыя эмоцыі і дзеляцца імі з публікай.

Пасля рамантычнай жаночай мастацкай часткі глядач трапляе ў абсалютна адрозную ад папярэдняй шэрую залу, дзе прадстаўлены «калядныя» абстракцыі Рыгора Іванова. Тут па-іншаму пабудаваны колеравы шэраг: здаецца, мастак стварыў вокны, дзе бачыш асобнае жыццё. Прастора для фантазіі вольная. Кожнае акно — шанц адкрыць для сябе дзень па-новаму, адчуць паток энергіі альбо вярнуцца ў нейкі прыемны момант жыцця.

Пры тым, што ўсе мастакі пазіцыянуюць сябе незалежнымі адзін ад аднаго творцамі, агульныя рысы ў іх творчасці можна заўважыць. Магчыма, таму, што кожны з іх імкнецца ўнесці пачуццё радасці, захаваць мяккасць твораў. Усе Івановы напаўняюць прастору палатна і сонцам, і сусветам, і багатай палітрай станоўчых эмоцый.

Выстаўкай «Святло Раства» галерэя «Арцель» адкрыла вялікую серыю праектаў «Знакамітыя мастацкія дынастыі Беларусі», якая будзе накіравана на вывучэнне патэнцыялу сямейнай творчасці ў краіне. Па словах мастацтвазнаўцы Наталлі Сяліцкай, такі праект быў патрэбны даўно: каб зразумець, якім чынам будуюцца адносіны ў творчых сем'ях, і як мастакі прымудраюцца не капіраваць адзін аднаго. Праект Івановых «Святло Раства» стаў першым у гэтай серыі менавіта таму, што гэтая дынастыя жадае і ўмее ствараць свята не толькі для сябе, але і для людзей, якія цікавяцца мастацтвам.

**Вікторыя АСКЕРА**

■ Нотны радок

# У ТЫМ ГОРАДЗЕ...

## Мелодыя-малітва як памяць пра злачынствы супраць чалавека

**У дзень, калі ва ўсім свеце згадваюць ахвяр Халакосту, у Беларусі адбудзецца асаблівы канцэрт: Музычная капэла «Санорус» прадставіць праграму «Кадзіш». У канцэртнай зале «Верхні горад» збяруцца былыя вязні канцлагераў, тыя, хто пацярпеў ад генацыду, члены Беларускага таварыства «Узаемаразуменне і прымірэнне», прадстаўнікі пасольстваў Ізраіля, Польшчы, Францыі. Канцэрт адбудзецца пры падтрымцы пасольства Германіі ў Беларусі.**

Прагучыць музыка замежных і беларускіх кампазітараў, якая так ці інакш звязана з падзеямі, пра якія ўспамінае ўвесь свет. Менавіта 27 студзеня савецкімі войскамі быў вызвалены канцэнтрацыйны лагер «Асвенцім» і адкрылася жудасная праўда пра нянавісць на нацыянальнай глебе, праз якую была створана цэлая сістэма знішчэння людзей. Гэта закранула і нашы землі, дзе падчас Другой сусветнай вайны знішчаліся насельнікі яўрэйскіх гета, а шмат хто таксама трапляў у лагеры смерці. Успомніць ахвяр антысемітызму, ксенафобіі і нецярпімасці прапануюць канцэртам-памяццю, арганізаваным аркестрам і хорам заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Музычная капэла «Санорус» Мінскай вобласці» пад кіраўніцтвам Аляксандра Хумалы. Малады дырыжор, выхаванец беларускай музычнай школы, які ўдасканальваў сябе ў Ротэрдамскай кансерваторыі, быў адзначаны на міжнародных конкурсах, цяпер імкнецца працаваць на радзіме ярка, ствараючы адметныя праграмы. І ў гэтым канцэрце ён сабраў выдатных салістаў, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў: скрыпачоў Ксенію Бельцюкову і Аксану Герасімёнак, Аляксандра Іванова (альт), Ірыну Кучынскую (сапрана). Удзельнічае і народны артыст Беларусі Уладзімір Пятроў.

Назву праграме дала сумная яўрэйская песня-малітва, што мае назву «Кадзіш». Яе апрацаваў французскі кампазітар Марыс Равэль у пачатку XX стагоддзя. Мелодыя, што суцяшае, адкрывае сэрца для любові. Малітоўны настрой са зваротам да Бога акрамя гэтай песні адлюстраваў нямецкі кампазітар Макс Брух — прагучыць яго твор «Кол Нідрэй». Музыка французскага кампазітара Франсіса Пуленка, які перажыў дзве сусветныя вайны, звяртаецца да людзей: прагучыць урывак з кантаты «Твар чалавечы».

Чакаюцца прэм'еры для Беларусі: упершыню ў нас прагучыць твор нямецкага кампазітара Арнольда Шэнберга «Ацалелы з Варшавы» і «Спакойная ноч» польскага кампазітара Хенрыка Мікалая Гурэцкага.

У такім канцэрце немагчыма было абмінуць мелодыі амерыканскага кампазітара Джона Уільямса з кінафільма «Спіс Шындлера». Таксама як і творы беларускіх кампазітараў: прагучыць арыя для скрыпкі і аркестра Льва Абеліёвіча і «Не той горад» Вольгі Падгайскай. У нас свае асобы ў музыцы з асаблівым адчуваннем гэтай тэмы. Таксама як ёсць і свая гісторыя памяці тых падзей.

**Марыя АСІПЕНКА**

■ Экспертыза

# «ЛІПА» НЕ ПРОЙДЗЕ

## Як вызначаюць падробкі?

**Дакументы — тое, з чым непарушна звязаны шлях чалавека ад нараджэння і да самай смерці. І, канешне ж, гэтыя паперы становяцца вельмі прыцягальным аб'ектам для іх фальсіфікацыі. Зрэшты, цяпер злачынцаў вывесці на чыстую ваду можна. Як гэта адбываецца, «Звяздзе» расказалі спецыялісты Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.**

— Безліч спраў звязана з грашовай падаплёкай, — кажа **вядучы дзяржаўны судовы эксперт аддзела экспертыз дакументаў і грашовых знакаў упраўлення экспертыз дакументаў і грашовых знакаў галоўнага ўпраўлення крыміналістычных экспертыз цэнтральнага апарата Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй КУЧЫН**. — Вось толькі ўзнікаюць яны часцяком з-за элементарнай неахайнасці. Напрыклад, дырэктары арганізацый пакідаюць на ўсялякі выпадак чыстыя аркушы паперы, на якія ставяць свае подпісы і адбіткі пячаткі. Злачынца пасля падстаўляе ў гэтую загатоўку абсалютна любы тэкст, які і прыводзіць да парушэння закона. Заводзіцца крымінальная або адміністрацыйная справа, пачынаецца разбіральніцтва, што было зроблена раней — рэквізіты або тэкст. Следчы пытаецца: а ці разумелі, што вашай даверлівасцю могуць скарыстацца зламыснікі ў сваіх мэтах? І ў адказ чуецца, як правіла, што, маўляў, я адпраўляюся ў працяглую камандзіроўку ці адпачынак, і трэба было падпісаць вельмі важныя дакументы па рабоце. Вось так хацеў сэканоміць час — а ў выніку парушыў правілы справаводства і самахоць трапіў пад прыцэл праваахоўных органаў.

А вось у грамадзянскай сферы падрабляюць ледзь не ўсю наменклатуру дакументаў. Напрыклад, возьмем тое ж завяшчанне. Быў у нас такі тастамент, у якім, здавалася, усё выглядае вельмі добра. Дадрукоўак ніякіх не было, як і дапісак. І здавалася б, і завярэнне натарыусам ёсць, але... Высветлілася, што якраз яно і было фальшывае. Подпісы і пячаткі таксама былі падробныя, іх раздрукавалі на прынтары.

***— А ці даводзілася сутыкацца з тым, што пячатка была згублена, а пасля знайшлася?***

— Быў такі выпадак у нас. Мы праводзілі экспертызу пячаткі, якая адрознівалася ад адбітка малапрыкметнай драбязой. Мы вырашылі пацікавіцца, ці не змянялася ў арганізацыі пячатка. І аказалася, што гэта адбылося. Проста яе аднавілі па эскізах у арганізацыі, дзе раней зрабілі згублены арыгінал. І вось тое невялікае адрозненне эксперт і знайшоў. А калі ініцыятар экспертызы прадастаўляў узоры пячаткі, то пра гэтую акалічнасць вырашыў не паведамляць.

***— Знакаміты пісьменнік Дунін-Марцінкевіч калісьці быў членам падпольнага сіндыката, які займаўся падробкай дакументаў падчас «разбору шляхты». Існуе версія, што ён наўмысна састарваў дакументы. А ці робіцца нешта падобнае цяпер?***

— Трапляла да нас такое завяшчанне. Візуальна здавалася, што тэкст набраны на друкарскай машынцы. Але аналіз паказаў, што паперу аддрукавалі на звычайным прынтары, проста падабралі шрыфт падобны з інтэрнэту.

### Факс, якога не было

— Мы можам аднавіць звесткі і на абясколеранай тэрмапаперы, — кажа **начальнік аддзела экспертыз дакументаў і грашовых знакаў упраўлення экспертыз дакументаў і грашовых знакаў галоўнага ўпраўлення крыміналістычных экспертыз цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Арцём МАКАРЭВІЧ**. — Вось вы бачыце гэты невялікі кавалак паперы. Што гэта такое?

**— Падобна па памеры на чэк. Але тут жа нічога не надрукавана. Толькі нейкія кругі.**

— Не зусім так. Калісьці тэкст тут быў, але выцвіў. А цяпер мы зробім вось так, — з гэтымі словамі Арцём Макарэвіч кладзе чэк пад лінзу апарата. І праз некалькі секунд на экране з'яўляюцца радкі з тэкстам, які пакідае касавы апарат.



— Тэрмапапера выкарыстоўваецца і пры факсімільнай сувязі, — працягвае Андрэй Кучын. — Некалькі год таму мы разбіралі вельмі цікавую справу. Чалавек прадставіў банку раздрукоўку факсавага дакумента, па якой хацеў зняць з рахунка даволі вялікую суму грошай. Арыгінала ў яго не было, маўляў, ён недзе прапаў. Спецыялісты банка паставіліся да клієнта з падазрэннем і звярнуліся ў следчыя органы. Была прызначана экспертыза. А вынік аказаўся нечаканы. Высветлілася, што гэты дакумент наогул ніколі не дасылаўся па факсе, а фактычна ўяўляе сабой «канструктар» з кавалкаў іншых папер. Напрыклад, частка інфармацыйнага радка, які абавязкова пакідае факс, была раздрукавана на звычайным лазерным прынтары і пасля ўмантавана ў тэкст. Махінацыі з дакументамі выходзяць і на міжнародны ўзровень. Напрыклад, у Беларусь аднойчы па абмене мусіў прыехаць адзін студэнт з Паўднёва-Усходняй Азіі. Але пасля з гэтага дакумента зрабілі загатоўку, па якой мог прыехаць хто заўгодна. І так у нашу краіну трапіла 57 чалавек замест аднаго. І каб не кемлівасць нашых памежных органаў, то гэтыя лік павялічваўся б і надалей.

### Аб карысці літары Z

А вось «пагарэць» на фінансавых справах неспрактыкаванаму чалавеку вельмі лёгка. Эксперты прыгадваюць выпадак, калі фірма мусіла выплаціць жанчыне даволі вялікія грошы — 5500 рублёў. Доўг вісеў даволі працяглы час, жанчына звярнулася ў суд і яго выйграла. А вось далей падзеі разгорталіся ў лепшых традыцыях 1990-х гадоў.

— Жанчыну выклікалі ў фірму і паабяцалі доўг вярнуць, але зрабіць гэта часткамі, — згадвае Арцём Макарэвіч. — Яна пагадзілася на гэта. У якасці першага траншу атрымала суму ў 500 рублёў, што і было адлюстравана ў адпаведным акце. Але яна не звярнула ўвагу на тое, што перад лічбай было пакінута белае поле, ды і суму, напісаную тэкстам, яна таксама не прачытала. Невялікая махінацыя з боку бухгалтара — і лёгкім дотыкам рукі 500 рублёў імгненна ператвараюцца ў 5500. Вось так увесь доўг быццам і спісаўся адным махам. Праз месяц жанчына зноў ідзе па грошы ў фірму. А ёй кажуць: «Грамадзянка, а вы хто?» — «Як хто, па доўг прыйшла» — «Не ведаем мы нічога» — «А папера?» — «Ну глядзіце...»

Таму вазьміце сабе на ўзбраенне: калі пры запаўненні якой-небудзь паперы засталося вольнае месца, то яго трэба перакрэсліць літарай Z.

### Што напісана пяром...

— Істотная праблема для нас — старыя пасведчанні аб нараджэнні, — зазначае Андрэй Кучын. — Натуральна, што дакументы, якім па 60—80 і нават больш гадоў, знаходзяцца з-за часу ў вартым жалю стане. І першая ж думка, якая ўзнікае пры ўзяцці ў рукі такога пасведчання, — тое, што яго трэба падклеіць. А каб лепш трымала, скарыстацца старым добрым канцылярскім клеем. Але справа ў тым, што звычайны сілікатны клей настолькі моцна выядае чарніла, што пасля аднавіць тое, што было імі напісана, амаль немагчыма. Таму калі вам усё трапіўся такі стары дакумент, то лепш яго акуратна згарнуць і пакласці ў тое месца, дзе яго не давядзецца часта чапаць.

Яшчэ адна памылка — спроба ламінавання старых папер. Але дзясяткі гадоў таму гэтай тэхналогіі не існавала, і таму структура паперы наўрад ці падыдзе для гэтага працэсу. Бо інакш амаль стапрацэнтна гарантавана негатыўнае ўздзеянне на чарніла і штэмпельную фарбу. І давядзецца дакумент аднаўляць. А як гэта зрабіць, калі гаворка ідзе пра даваенныя паперы?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### Тым часам

**Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз (ДКСЭ) падпісалі дамову аб супрацоўніцтве. Яна прадугледжвае сумесную работу ў сферы адукацыі, навукі і тэхнікі, садзейнічанне эфектыўнай рэалізацыі разнастайных праектаў і падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю.**

— Мы працуем амаль з усімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, — зазначыў **старшыня ДКСЭ Андрэй ШВЕД**. — І зацікаўлены ў высокакваліфікаваных кіраўніцкіх кадрах, якія і рыхтуе акадэмія. За апошнія чатыры гады больш за 160 нашых спецыялістаў прайшлі перападрыхтоўку на базе Акадэміі кіравання.

Акрамя таго, Акадэмія кіравання атрымала ў падарунак крымчамаданы, якія выкарыстоўваюцца ў працы эксперта. Па словах Андрэя Шведа, раней іх закуплялі ў замежжы, а цяпер гэты інструментарый робіцца менавіта ў Беларусі. Яны будуць выкарыстоўвацца падчас навучальнага працэсу.

Як паведаміў **рэктар Акадэміі кіравання Марат ЖЫЛІНСКІ**, супрацоўніцтва будзе насіць практыка-арыентаваны падыход. Група лепшых студэнтаў неўзабаве наведае камітэт, каб акрэсліць будучыя шляхі стасункаў.

■ На слыху

## Альпіністы знайшліся

**Ратавальнікі Эльбрускага высакагорнага пошукава-ратавальнага атрада МНС Расіі знайшлі двух зніклых альпіністаў з Беларусі, паведамілі сваякі хлопцаў.**



— Яны самастойна ў суправаджэнні ратавальнікаў ужо спускаюцца ўніз, — расказалі ў мясцовым выратавальным атрадзе. — Хлопцы здольныя самі перасоўвацца, усё нармальна. Хутчэй за ўсё, сувязі там не было, таму яны «маўчалі». Дабраліся да перавалу, відаць, хацелі выйсці на сувязь — рукзакі пакінулі ўнізе. Спачатку ратавальнікі знайшлі менавіта рукзакі, а потым і іх саміх.

Пошукавая аперацыя цягнулася два дні. У чацвер на пошукі беларускіх альпіністаў адправіліся восем чалавек, учора працавалі 13

■

■ Здарэнні

## Бром у кватэры

**Увечары сталічным ратавальнікам ад жыльцоў шматпавярховага дома паступіла паведамленне пра рэзкі хімічны пах у тамбуры кватэр на чацвёртым паверсе.**

На месца выкліку былі накіраваны падраздзяленні хімічнай і радыяцыйнай абароны МНС. Падчас разведкі было ўстаноўлена, што ў адной з кватэр мужчына разліў у памяшканні кухні каля літра вадкага брому. Ён, як і яго пары, таксічны, мае моцны непрыемны пах. Таму пацярпелы атрымаў інгаляцыйны апёк і быў дастаўлены ў бальніцу.

Работнікі МНС апрацавалі разліты бром шчолачным растворам і харчовай содай, правялі аналіз вызначэння хімічнага рэчыва для пацвярджэння, што гэта сапраўды бром. Пасля правядзення гэтых работ кватэра была апячатана для дэталёвага аналізу проб рэчываў у паветры спецыялістамі гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

## Бронзавая птушка з... могілак

**У сталіцы праваахоўнікі затрымалі падазраванага ў шматлікіх крадзяжах з могілак.**

Напачатку ў Першамайскі РУУС г. Мінска паступіла некалькі заяў аб знікненні вырабаў з каляровых металаў з могілак «Усходнія» («Маскоўскія») на праспекце Незалежнасці.

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку ўстанавілі, што падазраваным з'яўляецца 36-гадовы раней судзімы мінчанін. Зламыснік пападаў на могілкі праз адчыненыя брамкі ці пералазіў праз агароджу. Там фігурант звяртаў увагу пераважна на вырабы з каляровых металаў. Падазраваны краў бронзавыя фігуры птушак, бронзавыя вазы і падсвечнікі больш за 15 разоў. Як правіла, гэтыя прадметы ён здаваў у пункты прыёму каляровых металаў. Заведзена крымінальная справа, зламысніку пагражае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ, штрафу ці папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, або арышт ці абмежаванне волі на тэрмін да трох гадоў, ці пазбаўленне волі на той жа тэрмін.

## Куды лыжы «навастрыў»?

**У гарналыжным комплексе «Сілічы» мужчына ўзяў напракат чатыры пары лыж па чужым пашпарце і не вярнуў спартыўны інвентар, а звёз яго на дачу.**

Пра здарэнне ў Лагойскі РАУС паведаміла супрацоўніца комплексу, якая і выдала спартыўныя камплекты на чацвярых, бо зламыснік прыехаў на адпачынак з сям'ёй. Пасля заканчэння тэрміну пракату лыжы назад не вярнуліся. Вывучыўшы відэазапісы з камер назірання і пакінутыя пашпартныя даныя, міліцыянеры ўстанавілі, што чалавек на першых і на фатаграфіі ў дакуменце — не адна і тая ж асоба. Зрэшты, гэтая акалічнасць чамусьці не насцярожыла супрацоўніцу гарналыжнага комплексу і не перашкодзіла ёй выдаць кліенту камплекты лыж. Атрымаўшы падрабязнае апісанне падазраванага, праваахоўнікі ўстанавілі яго асобу. Зламыснікам быў 43-гадовы жыхар Салігорскага раёна. Яго затрымалі каля дома. Скрадзеныя лыжы былі знойдзены ў мужчыны на дачы. Заведзена крымінальная справа.

## «Сайга» і 130 патронаў

### Расіянін нелегальна правёз у краіну зброю

**Дваіх жыхароў Клімавіч і іх прыяцеля-масквіча затрымалі за незаконнае паляванне работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі.**

Позна ўвечары парушальнікі перамяшчаліся на аўтамабілі па паляўнічых угоддзях. Адзін сядзеў за рулём, другі з пярэдняга сядзення падсвечваў мясцовасць лямпай-ліхтаром, высочваючы дзічыну. Трэці — расіянін — быў ззаду напагатове з зараджаным карабінам «Сайга». Як высветлілася, сваю зброю масквіч прывёз у Беларусь нелегальна ў аб'езд установленага на граніцы пункта пропуску. Да яе ён захапіў 130 патронаў. Апроч магазіна ў карабіне, у машыне мелася яшчэ чатыры, цалкам зараджаных боепрыпасамі. Ствол зброі быў аснашчаны дульнай насадкай для аўтаматычнай стральбы чэргамі, паведамілі ў Дзяржінспекцыі. Акрамя таго, у машыне дзяржінспектары знайшлі яшчэ і незарэгістраваную гладкаствольную стрэльбу, якая належала беларусу, а таксама 16 патронаў да яе. Усіх траіх заключылі пад варту, аўтамабіль знаходзіцца пад арыштам. Заведзена крымінальная справа па факце незаконнага палявання з выкарыстаннем транспартнага сродку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

КЛАКСАН

# АЎТАМАБІЛЬ З ПРЫСТАЎКАЙ «АЙ-»



## Тэстуем, мабыць, самы незвычайны электракар сучаснасці

**У нас эксклюзіўныя аўтамабілі сустракаюцца рэдка. Забяспечаныя людзі хутчэй звернуць увагу на магутны і ёмісты пазадарожнік, чым на маленькі спорткар. Яшчэ б: дарогі ў нас добрыя, але не ідэальныя, надвор'е часта падносіць сюрпрызы (таму кабрыялеты ў нашых шыротах не надта карыстаюцца), ды і навошта прыцягваць да сябе лішнюю ўвагу? Але калі незвычайны аўтамабіль усё ж аказваецца на беларускіх дарогах, то глядзець і вывучаць яго будуць пастаянна — так і адбылося з BMW i3, колькасць якіх у нашай краіне можна палічыць па пальцах адной рукі.**

Аўтамабіль, які трапіў на наш тэст-драйв, належыць адкрытаму акцыянернаму таварыству «Беларускі народны банк» і выкарыстоўваецца, што вельмі важна, як службовы. Машына штодня развозіць пошту і розную дакументацыю ў межах сталіцы, пераадольваючы да 140 кіламетраў на працягу працоўнага дня. На аўтамабілі праехалі ўжо амаль 10 тысяч кіламетраў, таму самы час разабрацца, якія праблемы з'явіліся за час эксплуатацыі. Пра гэта мы пагутарылі з **начальнікам арганізацыйнага аддзела кіравання, развіцця і падтрымкі банкаўскай інфраструктуры банка Мікалаем ЛУКАШЭВІЧАМ.** Але спачатку трохі гісторыі.

## Чаму так дзіўна выглядае?

Сапраўды, знешнасць у BMW i3 футурыстычная. Вельмі цікавы кузаў зроблены з вугляпластыку, пры гэтым у аснове ляжыць металічная рама, у якой схаваны 170-моцны электрарухавік з цягай 250 Нм. І — зараз усе фанаты маркі павінны выдыхнуць — у гэтага аўтамабіля задні прывад, які, забягаючы наперад, нават на слізкай дарозе ўпэўнена ўтрымлівае машыну. Электракар важыць усяго 1200 кілаграмаў, яго даўжыня — 3999 міліметраў, так што па апошнім пакажчыку ён прыблізна аднолькавы з Opel Corsa — маленькім гарадскім хэтчбэкам.

Незвычайны вонкавы выгляд тлумачыцца патрабаваннямі інжынераў: калі хочаш зрабіць камфортны гарадскі аўтамабіль, то ўсё вырашае не аэрадынаміка і высокая хуткасць, а габарытная даўжыня і ўнутраная кампаноўка. Акрамя таго, аўтагіганты ў апошнія гады паступова паказваюць электракары — а як іх распазнаць у патоку, калі не па знешнасці? Дызайнеры нямецкай маркі папрацавалі вельмі сур'ёзна, і ў выніку атрымаўся аўтамабіль, які смела можна назваць гарадской машынай будучыні.

Пры знаёмстве з аўтамабілем кідаецца ў вочы, наколькі вялікія і адначасова вузкія ў яго колы — 155/70 R19. Практычна матацыклетныя шыны з'явіліся тут не проста так: яны эканомяць электраэнергію, а таксама лепш коцяцца. Зразумелая справа: знайсці такую гуму ў нашай краіне нерэальна. Па словах Мікалая Лукашэвіча, зімовыя шыны Bridgestone давялося везці з Германіі пад заказ. Вось і першая праблема: калі купляеце незвычайны аўтамабіль, будзьце гатовыя да нетрывіяльных складанасцяў.

З-за таго, што аўтамабіль даволі высокі, а шыны вузкія, адразу з'явілася асцярога, што ўзімку на ім перасоўвацца некалькі небяспечна. «Так, гэтая машына — не зусім для зімы, — згаджаецца Мікалай. — Кіроўца, які штодня на ёй ездзіць, скардзіўся, што яго часам заносіць, аднак са мной такога не адбывалася. Аўтамабіль вельмі добра трымаецца на дарозе, але натуральна, калі ўвайсці ў паварот на вельмі высокай хуткасці, то любую машыну можа занесці. Так што спяшацца не варта».

Яшчэ вонкава «чапляе» лінія шклення — яна ламаецца рэзка і бесцырымонна, нібы ўсім назло. Вядома, зачароўваюць і кантрасныя элементы кузава. Знешнасць атрымалася іншародная, але завершаная. А колькі людзей прыцягвае гэты электракар! Любы прыпынак на святлафоры стане для кіроўцы-інтраверта сапраўднай праблемай, бо гэтая машына — пастаянна ў цэнтры ўвагі. Са знешнасцю разабраліся — а што ж чакае ўнутры?



## Салон — з бляшанак і бутэлек

Перад тым, як патрапіць унутр, трэба адкрыць дзверы — а яны тут нязвыклыя. Пярэднія зроблены класічна, а вось заднія адкрываюцца супраць ходу. Цэнтральнай стойкі тут няма, таму трапіць на задняе сядзенне лёгка — і здаецца, што месца там зусім няма. Аднак гэта не так: за кіроўцам нават ростам 190 сантыметраў свабодна размяшчаецца пасажыр такога ж росту. Дарэчы, машына не падыдзе для пяцярых чалавек: цэнтральнае месца на задняй канапе заняў двайны падшклянак, патоплены ў сядзенне.



Калі Мікалай заводзіць аўтамабіль, то высвятляецца другая праблема. «Бачыце, зараз максімальна магчымы запас магутнасці — усяго 100 кіламетраў, а летам — больш за 250», — кажа ён. Гэта звязана з надыходам зімы: у дзень тэст-драйву на вуліцах сталіцы стаяў 15-градусны мароз. Сапраўды, холад значна з'ядае ёмістасць батарэі — і гэта, на жаль, не міф. Пры куплі электракара трэба ўлічваць, што ўзімку магчымасць руху можа быць абмежаваная. І, дарэчы, батарэя гэтага аўто ў вельмі добрым стане, паколькі машына ніколі не разраджалася да нуля і набытая была новай у салоне ў Германіі.

Дык вось, футурызм мадэлі працягваецца і ў салоне. Матэрыялы, якія абступаюць кіроўцу і пасажыраў, «дыхаюць» экалагічнасцю: алюміній — гэта перапрацаваныя банкі ад напояў, тканіна сядзенняў — з пластыкавых бутэлек. Важна падкрэсліць, што вынік атрымаўся вельмі дарагі на выгляд і навобмацак. Няхай матэрыялы і зроблены з учорашніх адходаў, ні пра якую страту якасці казаць не прыходзіцца.

Геаметрыя пярэдняй панэлі спачатку вельмі нязвыклая — але літаральна праз паўгадзіны язды да яе прывыкаеш і не разумееш, чаму не ва ўсіх аўтамабілях робяць такім чынам. Мінімалізм прыбораў стварае адчуванне лёгкасці, два экраны выводзяць усю неабходную інфармацыю. Дарэчы, гэтая машына зусім не ў поўнай камплектацыі: скажам, няма камеры задняга віду, хоць ёсць парктронік, клімат-кантроль — толькі на адну зону. Але няма адчування, што цябе недзе падманулі ці чагосьці недадалі. А мультымедыйная сістэма гэтага аўтамабіля — сапраўдны стандарт, на які павінны абапірацца ўсе аўтамабільныя кампаніі.

Што здзівіла, дык гэта селектар пераключэння перадач — такі адростак збоку ад руля, які крыху нагадвае «качаргу» амерыканскіх аўтамабіляў. Сёння мала хто можа сабе дазволіць змяніць класічную схему прыбораў, але эксперымент BMW даказвае, што магчыма ўсё.

Што датычыцца багажніка, то ён малы — усяго 260 літраў, але заднія сядзенні складваюцца ў ідэальна роўную падлогу — тады аб'ём складзе прыстойныя 1100 літраў. Дарэчы, спераду пад капотам знаходзіцца невялікі дадатковы багажнік, побач — усяго чатыры спецыяльныя бачкі: пад астуджальную і тармазную вадкасць, шклоачышчальнік, а таксама для вадкаснага ацяпляльніка. Вось і ўсё абслугоўванне: трэба толькі ў час усё заліваць. Па плане тэхнічнае абслугоўванне трэба прайсці раз у два гады.

Перад тым, як адправіцца ў дарогу, аўтамабіль трэба трохі прагрэць — тут ёсць падабенства з бензінавымі і дызельнымі сабратамі. Але ў нашым выпадку прычыны іншыя: не хочацца траўмаваць батарэю, а таксама не хочацца, каб электракар падтармажваў. Некалькі хвілін — і вадзіцель пераключае селектар перадач у становішча Drive. Дык як жа едзе BMW i3?

## Здань на дарогах

Цішыня — гэта слова, якое ў поўнай меры характарызуе тое, як гэты аўтамабіль едзе. Электраматор працуе ледзь чутна, шумаізаляцыя — на вышыні, таму няма розніцы, стаіць BMW i3 на святлафоры ці едзе з хуткасцю 60 кіламетраў у гадзіну. Машына вельмі ўпэўнена разганяецца: па пашпарце 100 кіламетраў у гадзіну яна дасягае за пяць-шэсць секунды. Па словах Мікалая, адчуваецца гэты разгон на 5-6 секунд. Пад педаллю газу ў кіроўцы — максімальная аддача з мінімальных абаротаў, таму ў патоку ён адчувае сябе вельмі ўпэўнена.

Цікава, што такая дынаміка электракара — гэта трэцяя праблема ў рамках перамяшчэння па беларускіх дарогах. «Сітуацыя: машына на нерэгуляваным скрыжаванні збіраецца павярнуць на аднапалосную дарогу — і раптам кіроўца бачыць удалечыні наша аўто. Першая машына спакойна выконвае манеўр, кіроўца перастае глядзець у бок i3, а дарма: электракар настолькі бясшумны і рэзкі, што можна нават не заўважыць, як ён пераадолее гэтую адлегласць», — распавёў Мікалай.



У гэтым аўтамабілі можна не карыстацца педаллю тормазу наогул — калі адпусціць педаль газу, машына адразу пачынае запавольвацца. Заднія фары працуюць у аўтаматычным рэжыме, таму пра бяспеку перажываць няварта. Падобны фармат руху — яркі прыклад рэжыму рэкуперацыі: калі BMW i3 спыняецца, назапашаная энергія вяртаецца ў батарэю для паўторнага выкарыстання. А яшчэ гэта вельмі зручна, таму што тармазы практычна не зношваюцца.

Вытворца гэтага электракара вельмі шануе традыцыі, таму машына набыла ад сваіх сабратаў востры руль, які імгненна рэагуе на рашэнні кіроўцы, а таксама сабраную падвеску, якую з нацяжкай можна назваць трохі жорсткай. За час тэст-драйву, нават пры ўваходжанні ў паварот з хуткасцю 60—70 кіламетраў у гадзіну, заднюю частку машыны не знесла ні разу — а гэта заднепрывадны аўтамабіль!

## Ці ёсць у Беларусі інфраструктура для электракараў?

На жаль, пакуль усё ў пачатковай стадыі — і гэта, напэўна, адна з прычын, па якой BMW i3 афіцыйна ў Беларусі не прадаецца. Зараджацца можна ад звычайнай разеткі, праўда, гэта адбярэ шэсць-сем гадзін. Спецыяльных зарадных станцый у межах сталіцы — больш за дзесяць, нямалы ўнёсак у развіццё сеткі робіць і БНБ-Банк, які адкрыў дзве абсалютна бясплатныя зарадкі ў Мінску і адну — у Гродне.

Усталяванне зарадных станцый для электрамабіляў ад Беларускага народнага банка запланавана ў рамках праграмы «СМАрт Энерджы», якая рэалізуецца пры падтрымцы Паўночнай экалагічнай фінансавай карпарацыі. Гэтая праграма накіравана на садзейнічанне развіццю электратранспарту і заряднай інфраструктуры ў Беларусі.

Што можна сказаць пра BMW i3 у выніку? Канешне, пакуль яшчэ не хапае зарадак, зіма памяншае ёмістасць батарэі, але для тых, хто клапоціцца аб экалагічнасці і эканамічнасці свайго транспарту, для прыхільнікаў тэхналогій будучыні электрамабілі — гэта ўжо хутчэй «сёння», а не далёкае «заўтра».

Гэта машына створана для мернай гарадской язды, таму ў ідэале трэба разглядаць яе як дадатковы сродак перамяшчэння. Але якая колькасць беларусаў можа набыць сабе другі аўтамабіль на электрацязе па цане топавага бензінавага або дызельнага седана той жа Audi? Вядома, пытанне рытарычнае, аднак тое, што такія электракары з'яўляюцца на беларускіх дарогах, уносіць у шэрасць будняў рэальную экзотыку. І цалкам магчыма, што, убачыўшы на святлафоры BMW i3, наватары абавязкова задумаюцца над тым, каб купіць сабе такую машыну.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ВОСТРАЎ РЭГІ



## Як жывецца на Ямайцы?

**Летась Ямайка прыняла рэкордную колькасць турыстаў — 4,3 млн чалавек (прычым на востраве цяпер 2,8 млн жыхароў). Пра гэта заявілі ва ўпраўленні па турызме краіны (JTB). Як адзначылі ў ведамстве, у параўнанні з 2016 годам рост замежнага турпатоку на востраў-дзяржаву склаў 21,1 працэнта. Пры гэтым 2,3 млн турыстаў прыбылі на Ямайку на самалёце, астатнія — шляхам круізных зносін. Агульны даход ад уязнога турызму — 3 млрд долараў, перадае Travel Russian News. Чым прываблівае Ямайка?**

### ТАІНА, ПІРАТЫ І МАРОНЫ

Востраў-дзяржава (трэці па плошчы сярод Вялікіх Антыльскіх астравоў), які размешчаны ў Карыбскім моры на поўдзень ад Кубы і на захад ад Гаіці, мае багатую гістарычную спадчыну. У старажытнасці карэнныя жыхары Ямайкі — індзейцы таіна. Востраў быў адкрыты Хрыстафорам Калумбам у 1494 годзе. Калумб назваў яго ў гонар каралеўскай пары вострам Фердынанда і Ізабэлы. Гэтая «шыльда» не прыжылася, востраў захаваў мясцовую назву — Ямайка (з мовы індзейцаў перакладаецца як «востраў крыніц» або «зямля крыніц»). Сваё першае паселішча тут іспанцы заснавалі ў 1509 годзе. Да іх прыходу Ямайку засялялі індзейцы, колькасць якіх дасягала 60 тысяч чалавек. За перыяд іспанскага панавання індзейцы на востраве зніклі амаль цалкам — да 1611 года тут налічвалася ўсяго 74 індзейцы. У якасці працоўнай сілы іспанцы ўжо ў пачатку XVI стагоддзя пачалі завозіць неграў-рабоў з Афрыкі.

Аднак іспанцы за паўтара стагоддзя каланізавалі востраў не надта актыўна, і ў 1655 годзе яго захапілі англічане (афіцыйна Ямайка была абвешчаная брытанскай калоніяй у 1670-м). На беразе шырокай натуральнай гавані, недалёка ад цяперашняга Кінгстана, англічане пабудавалі форт. Каля форта стаў расці горад Порт-Раял. Неўзабаве ён набыў славу «самага грэшнага горада ва ўсім хрысціянскім свеце», паколькі сюды з вострава Тартуга перамясцілася «сталіца» марскіх разбойнікаў. У канцы XVII стагоддзя ў горадзе Порт-Раял было восем тысяч жыхароў, з іх паўтары тысячы піратаў. Яны рабавалі іспанскія караблі, звозілі здабычу ў Порт-Раял, што прывяло да росквіту горада. Аднак 7 чэрвеня 1692 года большая частка гэтага «распуснага Вавілона» ў выніку землятрусу знікла ў марской бездані. Узрадаваная царква каталіцкай Іспаніі паспяшалася паведаміць, што «Бог пакараў бязбожны горад за грахі».

Аднак да таго часу англічане ўжо грунтоўна атабарыліся на Ямайцы, ператварыўшы востраў у буйную «цукровую» калонію — тут інтэнсіўна развіваліся плантацыі цукровага трыснягу. Большая іх частка размяшчалася на раўнінах поўдня вострава. Унутраныя раёны выкарыстоўваліся для выпасу жывёлы. Прамысловасць Ямайкі выраблял цукар-сырэц, патаку-меласу і знакаміты ямайскі ром. Англічанам дастаўлялі немалы клопат паўстанні неграў-рабоў. За прыкладна 150 гадоў, да пачатку XIX стагоддзя, было не менш за 30 такіх паўстанняў. Ужо ў другой палове XVII стагоддзя ў найбольш аддаленых горна-лясістых раёнах Ямайкі ўладкаваліся мароны — збеглыя негры-рабы і іх нашчадкі, якія стварылі нешта накшталт уласнай дзяржавы. Яны здзяйснялі набегі з мэтай захопу жывёлы і дзеля іншых рабаванняў, і ў выніку англічане ў канцы XVIII стагоддзя правялі дэпартацыю маронаў у Афрыку (у Сьера-Леонэ яны заснавалі горад Фрытаўн).

У XIX стагоддзі, пасля адмены рабства ў 1833 годзе, для англійскіх плантатараў на Ямайцы наступілі «дрэнныя часы». Вызваленне неграў-рабоў істотна падарвала плантацыйную гаспадарку Ямайкі. Завоз працоўных-кантрактнікаў з Індыі і Кітая не выправіў сітуацыю. Вытворчасць цукру на Ямайцы рэзка скарацілася. Да таго ж павялічылася канкурэнцыя з-за росту выпрацоўкі буракавага цукру ў Еўропе і павелічэння вытворчасці на Кубе і Яве.

### ПРЭЗІДЭНТ ЦІ КАРАЛЕВА?

У XX стагоддзі эканамічная сітуацыя на Ямайцы істотна змянілася ў выніку прытоку інвестыцый з ЗША. Кампаніі з гэтай краіны арганізавалі тут буйную экспартную вытворчасць бананаў, а таксама какавы, кавы і какосаў. Амерыканцы заняліся і развіццём інфраструктуры вострава (сярод іншага з'явілася чыгуначная сетка). У 1943 годзе было ўведзена ўсеагульнае выбарчае права, у 1944-м — частковае самакіраванне. У 1959 годзе тэрыторыя атрымала ўнутранае самакіраванне, а 6 жніўня 1962 года Ямайка стала незалежнай дзяржавай.

Краіна дасюль з'яўляецца каралеўствам, улада ажыццяўляецца ў выглядзе канстытуцыйнай манархіі. Кіраўнік дзяржавы — брытанскі манарх (каралева Вялікабрытаніі Лізавета II), прадстаўлены генерал-губернатарам, які прызначаецца ім па рэкамендацыі прэм'ер-міністра Ямайкі. Генерал-губернатар ажыццяўляе ад імя каралевы ўладу ў краіне. Ён падпісвае ўсе законапраекты і прызначае прэм'ер-міністра (з членаў партыі, якая перамагла на выбарах). Пры генерал-губернатары функцыянуе кансультацыйны орган з шасці



членаў — Таемны савет, які фарміруецца ім па рэкамендацыі кіраўніка ўрада. Па яго ж прадстаўленні генерал-губернатар прызначае членаў урада.

Знешнепалітычны курс краіны істотна вагаўся ў залежнасці ад таго, якая партыя стаяла ва ўладзе. Так, урад Лейбарысцкай партыі Ямайкі (ЛПЯ) у 1962—1972 гадах арыентаваўся на ЗША і Вялікабрытанію. Кабінет, сфарміраваны Народнай нацыянальнай партыяй у 1972—1980 гадах, рабіў упор на лозунгі недалучэння і салідарнасці з краінамі «трэцяга свету», умацоўваў адносіны з Кубай. ЛПЯ, вярнуўшыся да ўлады, разарвала адносіны з «востравам свабоды» і зноў пераарыентавалася на ЗША. Праўда, у канцы 1980-х сітуацыя змянілася — Ямайка праводзіць больш узважаную знешнюю палітыку.

Цікава, што ў 2012-м, у год 50-годдзя здабыцця незалежнасці ад Злучанага Каралеўства, дзяржава выказала жаданне выйсці з Садружнасці нацый і стаць «паўнавартаснай» рэспублікай. Пра гэта ў сваёй інаўгурацыйнай прамове заявіла тагачасны прэм'ер-міністр Ямайкі Паршэ Сімпсан-Мілер. Букінгемскі палац адказаў, што рашэнне аб дзяржаўным ладзе Ямайкі — за насельніцтвам дзяржавы, а не за кімсьці іншым. У 2016 годзе ў The Independent з'явілася інфармацыя аб тым, што ямайскія ўлады пачынаюць абмеркаванне маштабнай канстытуцыйнай рэформы, якая, у ліку іншага, зменіць дзяржаўную форму праўлення з канстытуцыйнай манархіі на парламенцкую рэспубліку. Генерал-губернатар Ямайкі Патрык Ален апублікаваў адпаведную прапанову ў пасланні да парламента. Паводле яго слоў, мяркуецца, што брытанскую каралеву Лізавету II, якая з'яўляецца фармальным кіраўніком дзяржавы, зменіць прэзідэнт з мінімумам уладных паўнамоцтваў. Таксама новы закон прапануе ўвесці фіксаваныя даты выбараў прэм'ер-міністра і абмежаваць тэрмін яго знаходжання ва ўладзе. Для ўступлення ў сілу гэтыя прапановы павінны быць адобраны заканадаўчай уладай. Пераўтварэнні меркавалася зрабіць на працягу двух гадоў. Пры гэтым у парламенце прапануюць дапоўніць закон пакетам антыкарупцыйных паправак. Варта заўважыць, што пакуль адпаведныя рэформы не рэалізаваныя.

### ПРЫЦЯГНЕННЕ БОБА МАРЛІ

Найважнейшым стратэгічным карысным выкапнем астраўной дзяржавы з'яўляюцца баксіты, па запасах якіх Ямайка займае вядучае месца ў свеце. Адпаведна галоўны кірунак прамысловасці — апрацоўка гэтых рэсурсаў для адпраўкі іх на экспарт. Разам з алюмініем, гліназёмам, лесам (пад якім цяпер 1/5 частка тэрыторыі) і значным водным патэнцыялам гэта галоўная прыродная скарбонка Ямайкі. Каля 20 працэнтаў працуючых занятыя ў сельскай гаспадарцы. Гэтая сфера забяспечвае пастаўкі за мяжу шэрагу харчовых пазіцый, сярод якіх цукар, кава, сусветна вядомы ром.

Галоўным сектарам эканомікі Ямайкі безумоўна з'яўляецца сфера абслугоўвання, дзе фарміруецца больш за 60 працэнтаў агульнага аб'ёму валавага ўнутранага прадукту. Асноўныя крыніцы даходаў у канверсоўнай валюце — апроч грашовых паступленняў ад тых, хто працуе за мяжой (20 % ВУП), абслугоўванне турыстаў. Прычым аб'ёмы прыезджых стабільна павялічваюцца. І нездарма — турысты належным чынам ацанілі перавагі краіны на Карыбах. Некалькі гадоў таму найбуйнейшы ў свеце сайт аб падарожжах TripAdvisor склаў рэйтынг лепшых астравоў для наведвання. У першую тройку трапіла Ямайка. Урад астраўной дзяржавы ўсяляк заахвочвае інвестыцыі ў развіццё турызму і стварэнне новых сумесных прадпрыемстваў. Прычым накіроўваюцца інвестыцыі не толькі ў развіццё элітных гатэляў, але і гасцініц, разлічаных на клас эканом, каментуе Jamaica Gleaner. Сталіца Ямайкі — Кінгстан — уключана ў спіс крэатыўных гарадоў ЮНЕСКА ў музычнай катэгорыі. На думку ямайскага кіраўніцтва, гэта дазволіць абнавіць горад і прыцягнуць больш замежных турыстаў. Міністр турызму Ямайкі Даміён Кроўфард назваў гэтую падзею «значным дасягненнем», якое можа ўмацаваць імідж краіны і будзе спрыяць яе развіццю, паведамляе Jamaica Observer.

Насамрэч Ямайка — радзіма растафары і рэгі. Найвядомейшы ў свеце выканаўца рэгі — Боб Марлі. Дасюль апроч 70 афіцыйных пляжаў адметнасцю вострава называюць дом-музей і маўзалей легендарнага музыканта. Ён і праз 37 гадоў пасля смерці тут застаецца ямайцам нумар адзін. «Сёння пятніца, другая гадзіна дня. У гэты час вы можаце пачуць толькі рэгі. Я сяджу ў сваёй кватэры ў Кінгстане і чую, як Боб Марлі пераклікаецца сам з сабой злева, справа і зверху. Гэта дзіўнае вар'яцтва», — расказваў галоўны трэнер зборнай Ямайкі з 2013 па 2016 год, адзін з галоўных футбольных падарожнікаў у свеце Вінфрыд Шэфер, перадае championat.com. Ямайка з'яўляецца адным з самых папулярных турыстычных напрамкаў у Карыбскім басейне, асабліва вядома сваімі курортамі па сістэме «ўсё ўключана». Востраў поўны легендарных турыстычных мясцін, сярод іх — Мантэга-Бай, Негрыл, Оча-Рыас.



Зрэшты, хапае тут і сваіх «падводных камянёў». Паўстагоддзя таму турызм на Ямайцы сапраўды пачынаўся з тусовак, якія ладзілі «дзецi кветак», аднак сёння «музыку» на востраве заказваюць іншыя кліенты — багатыя амерыканцы, канадцы і еўрапейцы, заўважае rosbalt.ru. Хтосьці знаходзіцца тут выключна дзеля прыемнага гультайства, але нямала і тых, хто прыехаў для актыўнага адпачынку. Як гэта часта бывае, за агароджай гатэляў сітуацыя зусім іншая, у тым ліку і ў сэнсе крыміналу. Турыстам цалкам абгрунтавана не раяць разгульваць у адзіночку за варотамі «курортных рэзервацый», асабліва з надыходам цемры і без ведання мовы. Адзіночны турызм на востраве так і не прыжыўся.

**Захар БУРАК.**

■ Жыццёвінкі

# У ВОРАГАХ У НАС ХАДЗІЎ ЛЯВОН МАЛЯВЕЦ...

На мяне, маіх сяброў Мішку і Грышку, што нарадзіліся да вайны, а пасля перамогі над фашыстамі на сваёй скуры напоўніцу зведалі голад, холад і нястачу, гэты палявы калгасны вартаўнік наводзіў жах.

Уявіце сабе такі малюнак. На калгасных гонях ужо не чуваць было людскога гоману. Убраны морква, буракі, бульба і позняя капуста. То нейкай драбнатой-сеянкай імжаць, то тугімі струменямі лупяць дажджы. Не толькі кіраўнікам рознага рангу, а нават калгасным коням Кейсу і Джыну, што дасталіся нашым войскам ад немцаў, было зразумела, што бульбяныя палеткі пераворвацца не будуць: сіл няма для гэтага, магчымасцяў, ды хутка ўслед за маразамі мяцеліцы разгуляюцца. А ў галовах нашых бацькоў б'юцца-пульсуюць думкі: як зіму перажыць? Сем'і ж, дзеці... Ад заробленых у калгасе працадзён-«палачак» жываты ці ўшчэнт усохнуць, ці апухнуць. Надзеі ж на ўласныя агароды самыя мінімальныя: на няўгноеных землях (рэдка ў каго ёсць карова) пастаянная няўрадзіца. От быў бы дазвол пакорпацца на тым убраным ужо полі калгаса не ў шкоду яму, глядзі, на два-тры мяшкі харчу папоўніліся б зімовыя запасы. А гэта — адчувальная падмога была б. Дык не ж, не было такога дазволу, не было. А без яго маглі не толькі штрафам пекануць, а і на лаву падсудных пасадзіць. Таму дарослы люд не адважваўся на такія рызыкоўныя крокі.

Мы ж, васьмі-дзевяці-дзесяцігадовыя, а то і большага ўзросту хлапчаняты, добра разумелі сітуацыю: цяжка бацькам, трэба дапамагаць ім. Яны ж стараюцца, з сіл выбіваюцца дзеля нас. І мы стараліся. То ўпаўшыя на пожню пасля жняяркі жытнёвыя каласкі для калгаса падбіралі, то маткам сваім, якія ў крук сагінаюся, арудуючы над збажыной сярпамі, перадых давалі хвілінак на дзесяць-пятнаццаць, самі ў ход пускаючы тыя сярпы ды перавязваючы снапы і ставячы іх у бабкі. То адшуквалі жалезнае ламачча рознае і косткі жывёльныя і здавалі іх каравашнікам (так называлі ў нас пакупнікоў рознага рыззя, што ездзілі на калёсах па населеных пунктах). У аптэку неслі высушаныя бадзягу, травы-зёлкі і крыльцы майскіх жукоў, а ў нарыхтоўчую кантору — карані хрэну. Капейку-другую зараблялі, выконваючы іншыя работы. Можа і драбязой усё гэта было для сямейнага бюджэту (праўда, такога слова ў той час мы нават не чулі), але ўсё ж ганарыліся: не гультаі, не дармаеды. Памочнікі!

А тут — бульба, глядзі, згніе за зіму, зямлёй стане. А нам яна, галодным, дазарэзу патрэбна. Таму — на поле. Без загаду бацькі ці маці. Але з іхняй маўклівай згоды. Торбачкі — пад паху. Нямецкую сапёрную рыдлёвачку — за пояс. Картуз — на самыя бровы. Каб Лявон не пазнаў. А ён, бачым, па полі на коніку гойсае. З канца ў канец. Пуга ў яго такая, што калі апяража каго — дзясятаму закажаш.

Але хіцер Зміцер, ды і Саўка не дурны. Я, Мішка і Грышка зашыліся ў кусты. Чакаем. Лявон не спяшаецца, таксама чакае. Чарговую ахвяру. Цэлую гадзіну, а мо і больш ляжым. Вартаўнік нарэшце крануў бакі каня сваімі чобатамі, развярнуўся і ўзяў напрамак на Чачэрск.

Хоць і рэдка, але бульба трапляецца. Шчасце, калі вывернеш цэлы корч, пяцьшэсць дзябёлых прыгажунь там. Дадому са здабычай вяртаемся задаволеныя. Галоўнае, што не пабітыя. Як узнагарода за працу — матчына ўсмешка, цёпленькая рука, што лагодна прайшлася па галаве, і тры словы: малайчына, памочнік, карміцель.

Але такіх вось удач асабіста ў мяне і маіх сяброў было няшмат. Часцей за ўсё ў нашых торбачках гуляла паветра, бо Малявец дзяжурыў да самых прыцемкаў. А з'явіўся ён на поле нечакана, да пары да часу затаіўшыся ў той ці іншай лагчынцы, пасля чаго рысцю імчаў на нас. Але ж мы давалі драпака, толькі пяткі бліснулі, у супрацьтанкавы роў, круты спуск і пад'ём якога не давалі каню хуткага ходу, ці да маяка, на планкі-лесвічкі якога «вораг» залазіць не адважваўся. Там і быў наш паратунак.

Праўда, аднойчы Лявон злез з каня і паспрабаваў затрымаць каго-небудзь з дзяцей. Ды атрымаўся канфуз. Бо нейкі штукарсмяльчак са старэйшых хлапцоў на карачках падпоўз да каня і так па-воўчы завыў, што той упродбркі рвануў прэч, і Малявец вымушаны быў па ліпкай гразі (а гэта больш за кіламетр) дабірацца дадому пешкі. Тры дні шукаў ён буланага. А той знайшоўся, кажуць, ажно ў Мяркулавічах, што, пэўна, за 18—20 кіламетраў ад райцэнтра.

На шчасце, мне і Мішку ўдавалася пазбягаць няшчадных, з зацяжкамі ўдараў Лявонавага бізуна, які рассякаў цела, надоўга пакідаючы на ім ныючыя болем пакутлівыя крывавыя рубцы. Але іншыя хлопцы, у тым ліку і Грышка, адчулі на сабе гэта напоўніцу.

Але такая вось «экзекуцыя» і самому злосніку-вартаўніку вылазіла бокам: бо не было таго лета, каб яго сад ночу не абтрушвалі. І тады Лявонава сям'я надоўга забывала, які водар і смак мелі іхнія яблыкі і грушы. Няцяжка здагадацца, хто за ўсім гэтым стаяў.

Намнога пазней мы зразумелі, што зманне Лявона Маляўца з «раскрадальнікамі і рабаўнікамі сацыялістычнага дабра» было не столькі яго асабістай справай, колькі служэннем той сістэме, якая панавала ў той час.

# ...А Ў КУМІРАХ — СЕНЬКА РЫЖЫ

На той час ён быў стары ўжо. Дробнага росту, худога целаскладу і гумарны. Сыпаў жартамі, прыпеўкамі і афарызмамі. Па ўсім відаць, начытаны быў. Сухенькая і кульгавая жонка Аніська баялася яго як агню, хоць ніколі ён не ўдарыў яе, як гэта здаралася ў іншых сем'ях. Бяздзетная пара жыла ў маленькай хатцы на беразе Чачоры, што ў кампаніі з Сожам у час вясновага разводдзя гушкала свае воды за якую паўсотню метраў ад іхняга жытла.

Андрэевіч вельмі любіў чарку — ніколі не прапускаў. Грошы ў яго, можна сказаць, не выводзіліся. Бо, маючы ў сваёй уласнасці жакі, сетку-путанку, нераты і «скрыпкі», ён зарабляў на рыбе.

Калі Андрэевіч адпраўляўся на ваду, мы ўтрох часта былі тут як тут. Спускалі на яе лодачку-душагубку, выносілі ў карытцы, якое нагадвала драўляныя начовачкі, сетку, пачыну (вясло, значыць). «Вярнуся гадзіны праз тры, — казаў. — Калі хочаце — сустракайце». Як тут не хацець? Ведалі: без рыбы не застанёмся. Так яно і было. Заўсёды. Сенька выходзіў з лодкі і з кошыка россыпам кідаў на траву штук дваццаць падрыхтаваных для нас плотак, акунёў ды шчупачкоў і задаволена смяяўся, назіраючы, хто з нас ухопіць іх больш. Мы ж пасля дзялілі здабычу пароўну.

Адзіным, каго пабойваўся Андрэевіч, быў рыбінспектар Палякоў, які сачыў за парадкам на водных прасторах ад Гомеля, дзе жыў, да Кармяншчыны. А гэта — кіламетраў, мо, пад 150, калі не болей. Ездзіў ён на маторнай лодцы, узброены пісталетам.

А Сенька быў пільны: пачуе матор — сетку ў тое карытца з вады і — шась у прысожскі лазняк. Затоіцца, пачакае і зноў за справу.

Але аднойчы, пры спадзе вады, калі ўжо дзе-нідзе вытыркнуліся з яе астраўкі і Андрэевіч браў напрамак дадому, з прыстані выскачыў Палякоў і паімчаў да Рыжага. Мы з цікавасцю з Замкавай гары за гэтым назіралі. Сенька — на астравок з лодкай. Паспрабуе Палякоў з маторам туды: мелка. Вылезе ён з лодкі і — у гумавых ботах — да рыбака, а той — на глыбіню. Гадзіны паўтары, мабыць, так працягвалася. А потым, бачым, Палякоў дастаў пісталет, паказвае яго Сеньку, а той і ў вус не дзьме. Ведае: не тая сітуацыя, каб страляць у чалавека. Рыбінспектар так і застаўся ні з чым.

Рыбу Сенька прадаваў не на рынку, а разносіў па хатах тым, ад каго быў заказ. Больш за ўсё яе куплялі яўрэі, што жылі ў цэнтры Чачэрска. Асаблівым попытам у іх карысталіся шчупакі, якіх яны фаршыравалі. Атрымаўшы грошы, Андрэевіч браў курс на «Чайную», якой камандаваў Аркадзь Бінкін. І там ужо даваў волю сваёй натуры. Напіваўся моцна, не шкадуючы наліць і каму-небудзь з разявак. Пасля чаго ішоў дадому да Аніські. Ды не даходзіў: выпітае недзе валіла яго з ног. І тут, як на тое, з'яўляўся міліцыянер Лажэвіч (як звалі яго, на жаль, не памятаю) і пачынаў будзіць яго, спрабаваў паставіць на ногі. Без толку. Валодаючы вялікай фізічнай сілай (спецыяльнага транспарту ў міліцыі тады не было), ён узвальваў яго на плечы і нёс. Сенька адразу ж прачынаўся і пачынаў на ўсю іванаўскую гарлапаніць: біты нябітага вязе, біты нябітага вязе! Пасля чаго зацягваў песню «Шумеў камыш». Народ рагатаў так, што міліцыянер адчуваў: ён становіцца пасмешышчам, і зноў спрабаваў паставіць таго на ногі. Але Сенька падаў і пад нейкую частушку ўшыркі раскідваў рукі.

Такая вось камедыя паўтаралася шмат разоў. І не кожны з іх заканчваўся дастаўкай Андрэевіча ў міліцыю, бо Лажэвіч упрошваў каго-небудзь з разявак адвесці таго дадому, калі ён крыху ачомаецца. Перавыхаваць Сеньку Рыжага так нікому і не ўдалося. А калі ён памёр, на пахаванні было шмат людзей. Намнога больш, чым на пахаванні Лажэвіча і Аркадзя Бінкіна, якія пайшлі на той свет пазней.

У нашым дзяцінстве гэты вясёлы і добры чалавек быў кумірам. У маёй галаве да гэтага часу не сцерліся ўспаміны аб ім.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ**

Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова



*Мне дзед казаў: лічы зімой завеі,*
*Ў вясновы час на ручаі зважай,*
*Калі ў Вялікдзень луг зазеляне —*
*Чакай пад восень шчодры ураджай!*

*Я з часам вызнаў шмат прыкмет шчаслівых*
*На поспех, на каханне, на сяброў.*
*Я веру, што рамонак квет цнатлівы*
*Прадкажа лепш, чым безліч мудрацоў.*

*Мне птах абвесціць: госці каля хаты!*
*І я па птушках часам варажу.*
*А шышка з хвоі ўпадзе калматай —*
*За падарунак «дзякуй» адкажу.*

*Няхай старых прыкмет нячутны голас*
*Нас пакрывам надзеі ахіне…*
*Я за абраз хаваю першы колас,*
*Каб не апошнім стаў ён для мяне.*

■ Ініцыятыва

# КАНЬКІ, ЭНТУЗІЯЗМ І МАГЧЫМАСЦІ

## У Краснапольскім раёне прэзентавалі хакейны фестываль

**Сталіцай свята стаў аграгарадок Януоўка. Менавіта тут на базе мясцовай школы была сабрана нядаўна хакейная каробка і адбыліся першыя матчы паміж камандамі Чавускага, Чэрыкаўскага і Касцюковіцкага раёнаў Магілёўшчыны.**



Фота Аляксандра ДАНЧАНКА.

Ініцыятарамі адраджэння на тэрыторыі раёна некалі страчаных традыцый гульні ў хакей сталі Краснапольскі мясцовы фонд развіцця «Старт-Усход», раённы фізкультурна-спартыўны клуб, дэпутаты Януоўскага сельсавета і мясцовая сельская школа. Гэтая ініцыятыва стала пераможцай у конкурсе праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). У януоўскіх хакеістаў (дарэчы, яны неаднаразова станавіліся пераможцамі раённых спаборніцтваў) з'явіліся спецінвентар і камплект сучаснай хакейнай формы. Усяго на рэалізацыю ініцыятывы было вылучана 13 881 еўра. А вось лядовая арэна ствaралася сіламі мясцовых дэпутатаў, раённага аддзела адукацыі, спорту і турызму Краснапольскага райвыканкама і прадпрымальніка Аляксея Варапаева.

— Спорт, здаровы лад жыцця — гэта прыярытэтныя кірункі ў палітыцы нашай дзяржавы. Вельмі важна, каб новыя спартыўныя аб'екты будаваліся не толькі ў буйных гарадах. Мы збіраемся зрабіць фестываль хакея адным з самых вядомых брэндавых спартыўных мерапрыемстваў раёна і штогод запрашаць на яго ўдзельнікаў не толькі з суседніх раёнаў Магілёўскай вобласці, але і найбліжэйшых раёнаў Гомельскай, а таксама Бранскай і Смаленскай абласцей Расійскай Федэрацыі, — адзначыла **старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН.**

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объектов (ул. Мостовая, 40Б, шоссе Скидельское, 8Б) в г. Гродно 27 февраля 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка, (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1*,** | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Мостовая, 40Б | 0,0671 | 440100000002009321 | 57 772,53 | 6 000,0 | 3 918,57 | Строительство административного здания 2-этажного с мансардным этажом |
| 2* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | шоссе Скидельское рядом с участком 8Б | 0,2217 | 440100000001010267 | 20 509,0 | 2 500,0 | 3 356,60 | Строительство объекта производственного назначения (2-этажный административно-бытовой корпус, встроенные технологические помещения) |

*земельный участок имеет ограничения;

**произвести снос объекта недвижимости без возмещения стоимости.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 27 февраля 2018 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. с 29 января по 21 февраля 2018 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 74-20-95, 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайон «Погораны-Кошевники», ул. Тетки) 27 февраля 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-578* | микрорайон «Погораны-Кошевники» | 0,1218 | 440100000003004571 | – | 18 752,45 | 3 700 |
| 2 | Земельный участок У-2*,** | ул. Тетки, 33 | 0,1067 | 440100000002009292 | 3 115,73 | 56 751,02 | 10 000 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

**Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земельного участка на природных территориях, подлежащих специальной охране.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 27 февраля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 29 января по 21 февраля 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 74 20 95, 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by

---

В отношении **частного торгового унитарного предприятия «ЗИГАНА»** ЕГР № 192587379 с августа 2017 г. Мингорисполком проводит процесс ликвидации. Печать организации, устав, свидетельство иные документы утеряны

---

## Открытое акционерное общество « Стройдетали». Месторасположение: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134 извещает о проведении 1 марта 2018 года очередного собрания акционеров общества по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134, (помещение столовой)

**Повестка дня:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год и основные направления развития в 2018 году.
2. Утверждение годового отчета, бухгалтерской отчетности и направлений использования чистой прибыли за 2017 год.
3. Утверждение акта аудиторской проверки деятельности общества за 2017 год.
4. Утверждение акта ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2017 год.
5. Утверждение размера дивидендов за 2017 год и сроков выплаты дивидендов.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало собрания в 16.00.

Время регистрации 15.00 – 15.50.

Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность. С информацией о деятельности общества можно ознакомиться в отделе экономики начиная с 1 февраля 2018 года.

Наблюдательным советом ОАО «Стройдетали» (протокол № 20 от 25.01.2018 года) принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 19.02.2018 года.

Справки по тел.: (8 01771) 2-25-01, 2-25-10

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж. Тел.: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 09 |

**Предмет аукциона – транспортное средство, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы 120/2**

| Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 738 | Грузопассажирский автомобиль GAZ-2705, 2008 г. в. (рег. знак AB 4693-1) | 4 500,00 | 225,00 |

**Порядок ознакомления с предметом торгов** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, начальник производственного участка, тел. 8 029 659-25-23

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте WWW.CPO.BY**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

